Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 КРАСАВІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 69 (28936)



«РУБЛЁЎКА» Ў КАСЦЮКОВІЧАХ

МС

СМАЛЯВІЧЫ ДЛЯ МІНЧАН

МС



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума НАН Беларусі:**

*«Ключавым фактарам захавання канкурэнтнасці краіны з'яўляецца развіццё лічбавых тэхналогій на аснове сумесных намаганняў дзяржавы і бізнесу ва ўсіх галінах. Ад таго, наколькі ўмела будуць выкарыстаны сучасныя IT-тэхналогіі, будзе залежаць паспяховасць на рынку тавараў і паслуг, а значыць, і ў сацыяльнай сферы. Краіна, якая вызначыла лічбавае развіццё ў якасці прыярытэтнага напрамку, актыўна інвестуе ў ключавыя актывы і галіны ІКТ, выкарыстоўвае бязмежныя магчымасці росту».*

## КОРАТКА

• **Сёння, 12 красавіка, БЧ адкрывае продаж білетаў на цягнік Мінск — Варна.**

• Студэнт Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога Павел Ганчароў стаў адным з лаўрэатаў навуковай прэміі імя Ільі Сегаловіча ў Маскве. Узнагароджанне складзе 350 тысяч расійскіх рублёў (Br11,5 тысячы).

• **Хакеісты мінскага «Юнацтва» абыгралі ў пятым матчы фінальнай серыі плэй-оф гродзенскі «Нёман» з лікам 2:0 і сталі ўладальнікамі Кубка Прэзідэнта.**



• Увечары 10 красавіка ў вёсцы Любашкі Камянецкага раёна з дому сышоў Іван Валошын, хлопчыку няма яшчэ двух гадоў. Супрацоўнікі міліцыі і МНС учора правялі лясны масіў у пошуках зніклага дзіцяці.

ISSN 1990 - 763X

Спецыяльны рэпартаж

# ТАКІ БЛІЗКІ КОСМАС

### Як у цэнтры Мінска кіруюць беларускім спадарожнікам

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.





**Мінчане і госці сталіцы, якія бывалі ў раёне Акадэміі навук, маглі звярнуць увагу на масіўную антэну, якая размешчана на даху будынка па адрасе Сурганава, 6. Але мала хто ведае, што верхні паверх будынка займае Навукова-інжынернае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Геаінфармацыйныя сістэмы». Яно з'яўляецца адным з асноўных распрацоўшчыкаў Беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі (ДЗЗ), а з 2004 года вызначана яе Нацыянальным аператарам. Акрамя гэтага, прадпрыемства забяспечвае бесперабойную эксплуатацыю Беларускага касмічнага апарата.**

**Да Сусветнага дня авіяцыі і касманаўтыкі нашы карэспандэнты на свае вочы паглядзелі, як працуе гэта ўстанова.**

### Як гэта працуе

...Экскурсію па прадпрыемстве для нас правёў **начальнік цэнтра эксплуатацыі Беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі Васіль СІВУХА.** Паводле яго слоў, на прадпрыемстве працуе каля 180 чалавек, а непасрэдна ў Цэнтры эксплуатацыі касмічнай сістэмы — 118. Астатнія супрацоўнікі займаюцца распрацоўкамі саміх геаінфармацыйных сістэм, праграмнага забеспячэння.

Цэнтр кіравання палётам беларускага касмічнага апарата па маштабах не надта падобны на тое, што мы звычайна бачым у кіно. Адзін вялікі экран, з дзясятак камп'ютараў перад ім... З іншага боку, які сэнс рабіць велізарную колькасць экранаў для аднаго апарата? З гэтага дастаткова кампактнага памяшкання праводзяцца сеансы сувязі, тут ствараюцца планы здымак, па оптавалаконнай сувязі яны перадаюцца ў Плешчаніцы (там знаходзяцца камандна-вымяральны пункт і антэна сістэмы кіравання спадарожнікам для прыёму і перадачы). Такім чынам спадарожнік і атрымлівае інфармацыю. Па зваротным напрамку са спадарожніка паступае тэлеметрычная інфармацыя, якая аналізуецца ў згаданым цэнтры.

Звязацца са спадарожнікам можна толькі ў пэўны час, калі ён знаходзіцца ў зоне бачнасці пункта ў Плешчаніцах (у радыусе дзвюх тысяч кіламетраў ад іх). Колькасць даступных сеансаў за суткі — два-тры разы днём і два-тры разы ноччу. Дарэчы, за дзень апарат робіць 15 абаротаў вакол Зямлі — і прыблізна пяць разоў уваходзіць у зону радыёбачнасці. Падчас сувязі ў каманды ёсць 10—12 хвілін, каб закласці на борт праграму палёту, згодна з якой спадарожнік будзе здымаць патрэбныя ўчасткі мясцовасці. Пасля ў зоне радыёбачнасці ён перадае адзнятую інфармацыю на прыём на антэну — тую самую, якая знаходзіцца на будынку па адрасе Сурганава, 6.

СТАР. 4

Надвор'е

# І зноў без дажджоў

### Сіноптыкі папярэджваюць, што ўначы можа падмарозіць да мінус 6 градусаў

**У бліжэйшыя дні пераважны ўплыў на надвор'е ў краіне будзе аказваць скандынаўскі антыцыклон. А ў сувязі з тым, што ён сфарміраваны ў халодным паветры, — разлічваць на цяпло не прыходзіцца. Па начах будзе падмарожваць, ды і ўдзень за кошт аблокаў паветра прагрэецца не надта моцна. І хоць будзе сапраўды воблачна, на большай частцы тэрыторыі нашага рэгіёна істотных ападкаў у выхадныя не прадбачыцца, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння днём чакаецца воблачнае з праясненнямі, пераважна без ападкаў надвор'е. Толькі ў цэнтральных і паўднёва-ўсходніх раёнах Гомельскай вобласці і паўднёвым усходзе Магілёўскай вобласці, дзе адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту, пройдуць дажджы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень па краіне чакаецца ад плюс 5 да плюс 11 градусаў.

У суботу і нядзелю надвор'е ў краіне будзе вызначаць перыферыя малярухомага скандынаўскага антыцыклону, які быў сфарміраваны ў халоднай паветранай масе. Будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра мінімальная ўначы ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, пры праясненнях будзе апускацца да 6 марозу. Удзень таксама будзе аднасна халаднавата, калі тэмпература паветра будзе падымацца не вышэй чым ад плюс 5 да плюс 12 градусаў. Па поўдні краіны ўначы чакаецца 3—4 цяпла, а ўдзень ад плюс 7 да плюс 13 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ГЭТА НЕ ПА-САЮЗНІЦКУ

## Прэзідэнт выказаўся пра дзеянні расійскіх партнёраў

**Аляксандр Лукашэнка правёў нараду з кіраўніцтвам Савета Міністраў Беларусі. Па словах кіраўніка дзяржавы, нарада была сабрана для таго, каб па прапанове ўрада разгледзець блок эканамічных пытанняў, для вырашэння якіх неабходны ўдзел Прэзідэнта.**

«Я б прасіў, каб гэта было коратка і аргументавана. Але калі атрымаў пералік пытанняў, мяне што здзіўляе: апошнім часам — можа быць, сродкі масавай інфармацыі хлусяць, можа быць, спецыялісты дакладваюць мне недакладную інфармацыю, — але я кожны дзень чую і чытаю інфармацыю пра тое, што наш асноўны гандлёвы партнёр — яны любяць сябе называць партнёры — усё больш і больш уводзіць санкцыі супраць Беларусі», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што Расія сама знаходзіцца пад санкцыямі і асуджае іх — у гэтым нашага суседа падтрымлівае і Прэзідэнт. «Але ў той жа час падобнай зброяй ваююць супраць найбліжэйшых сваіх саюзнікаў. То адно прадпрыемства закрылі, то другое. Потым ці то морква, ці то салата, ці то ўжо агуркі не спадабаліся. Ці то ў іх падазрэнне ёсць, што мы нешта тут пастаўляем не адтуль. І кожны дзень адбываецца закрыццё нашых прадпрыемстваў. Нам закрываюць рынак», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка прывёў у прыклад сітуацыю, як Беларусь паступіла паўтара года таму: кіраўніку дзяржавы паведамілі, што ў аварыйным стане знаходзіцца нафтаправод і нафтапрадуктаправод, якія праходзяць праз нашу краіну. «І нам трэба было б на некалькі дзён закрыць для рамонту гэтыя нафтаправоды. Але мы ж не зрабілі так, мы разумелі, што гэта нанясе шкоду Расійскай Федэрацыі. І тады я даручыў працаваць у аварыйным парадку, але не перакрываць гэтыя «дарогі», па якіх транспартуецца галоўны экспартны прадукт Расійскай Федэрацыі — нафта», — адзначыў беларускі лідар.

Ён дадаў, што гэта пытанне і зараз стаіць на парадку дня. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы папрасіў віцэ-прэм'ера Ігара Ляшэнку пры неабходнасці паставіць на рамонт нафтаправоды і нафтапрадуктаправоды, якія ідуць праз Беларусь.

«Стаўце і рамантуйце, таму што тое дабро, якое мы робім для Расійскай Федэрацыі, яно нам паварочваецца пастаянна злом. Там ужо знаходзіліся да такой ступені, што яны пачынаюць нам выкручваць рукі, — сказаў Прэзідэнт. — Я да таго, што ўрад нібыта гэтага не бачыць. Ну добра, сёння віцэ-прэм'ер працуе без года тыдзень, ён яшчэ не паспеў разабрацца, але ёсць жа і прэм'ер, і першы віцэ-прэм'ер, ды і вы павінны гэта бачыць. Мы павінны прымаць адпаведныя меры. Ну што мы ўвесь час — нас б'юць у левую шчаку, мы падстаўляем правую. Разбярыцеся і далажыце асобна на наступным тыдні».

Далей кіраўнік дзяржавы заклікаў агучыць пытанні для разгляду. «І хацеў бы выслухаць пункт гледжання — магчыма, ён ва ўрада ёсць — і па гэтым асноўным пытанні, па расійскім напрамку», — дадаў беларускі лідар.

### Пра ліцэнзіі і Банк развіцця

Па выніках нарады першы намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр Турчын пагутарыў з журналістамі:

«Самая галоўная навіна, якую досыць працяглы час чакае бізнес-супольнасць, — гэта пытанне ліцэнзавання. Сёння кіраўніком дзяржавы, скажам так, былі падтрыманы падыходы, якія прапануюцца ўрадам. Але дадзены даручэнні шэраг пазіцый дапрацаваць і аператыўна ўнесці на разгляд кіраўніка дзяржавы праект нарматыўна-прававога акта».

Па словах Аляксандра Турчына, Прэзідэнт падкрэсліў: трэба ліквідаваць тыя паняцці, якія на практыцы паказалі, што на сённяшні дзень яны з'яўляюцца анахранізмам. Гэта будзе датычыцца пераліку ліцэнзуемых відаў дзейнасці і ўмоў выдачы ліцэнзій.

«Не хацеў бы, вядома, загадваць, але я думаю, што мы павінны паставіць сабе задачу дзесьці на працягу месяца — мы будзем спадзявацца, што Прэзідэнт падпіша гэты дакумент», — сказаў першы віцэ-прэм'ер.

У Беларусі ўжо працяглы час вядзецца работа па лібералізацыі заканадаўства ў галіне ліцэнзавання. Аляксандр Турчын нагадаў, што Дэкрэтам № 7 каля 15 тысяч ліцэнзій было адменена. «На такую ж колькасць ліцэнзій прадугледжваецца знізіць вось гэтым праектам нарматыўна-прававога акта. Гэта значыць, двума дакументамі Прэзідэнта амаль на 30 тысяч ліцэнзій у краіне паменшае. Груба кажучы, гэта фактычна на 30 %», — дадаў ён.

Акрамя таго, яшчэ адно пытанне нарады — выхад са складу заснавальнікаў Банка развіцця Нацыянальнага банка. Прэзідэнт падтрымаў гэтую прапанову. Аляксандр Турчын растлумачыў сутнасць пытання: здарыўся канфлікт інтарэсаў — Нацыянальны банк ажыццяўляе наглядныя функцыі ў дачыненні да Банка развіцця, але ў той жа час з'яўляецца яго заснавальнікам. Такім чынам, канфлікт будзе вычарпаны, Нацыянальны банк застанецца наглядным органам, а ў складзе заснавальнікаў Банка развіцця застануцца Савет Міністраў і «Беларуськалій».

### Пра нафту і мяса

Таксама з журналістамі пагутарыў і намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка.

Ён адзначыў, што парадак узаемаадносін з галоўным стратэгічным саюзнікам і эканамічным партнёрам Беларусі — Расіяй, заўсёды знаходзіцца на парадку дня ўрада, так што і на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы гэтую тэму не абышлі ўвагай.

Паводле слоў намесніка прэм'ер-міністра, Прэзідэнту было далажана, як вядзецца работа ў рамках двухбаковай беларуска-расійскай рабочай групы па падрыхтоўцы прапаноў па далейшым развіцці інтэграцыі. «Яшчэ раз была акцэнтавана ўвага, што дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы з'яўляецца актуальным. Так, гаворка вядзецца пра тое, каб распачаць дадатковыя намаганні, каб у поўнай меры рэалізаваць палажэнні праграмы», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Таксама на сустрэчы абмяркоўваліся абмежаванні, якія ўводзяцца расійскім бокам па пастаўках рознай беларускай прадукцыі. Віцэ-прэм'ер дадаў, што мается на ўвазе функцыянаванне адзінай мытнай тэрыторыі ў рамках ЕАЭС без бар'ераў, — незалежна ад краіны ўвозу, калі прадукт прайшоў мытную ачыстку, то ён можа свабодна перамяшчацца па рынку ЕАЭС. Пакульназіраюцца пэўныя абмежаванні, пацвердзіў ён.

У прыклад намеснік прэм'ер-міністра прывёў сітуацыю з пастаўкамі ялавічыны на косці. «Была прадукцыя закантрактавана, і ў балансах яна ёсць. І тут ідуць пэўныя сігналы: ведаеце, трэба было б вам прытрымаць, паколькі ў нас ёсць магчымасці паставіць з нейкіх іншых краін, якія не ўваходзяць у Еўразійскі эканамічны саюз», — расказаў ён.

«Узнікала праблематыка па ўзаемадзеянні ў сферы энергетыкі. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як вядзецца перагаворны працэс па рэалізацыі дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты прэзідэнтамі дзвюх краін па ўзгадненні цэн на газ», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Намеснік прэм'ер-міністра адзначыў, што гэта робіцца з прычыны таго, што на 2019 год цэны вызначаны, але ў 2020 год трэба ўвайсці з адпаведнымі дамоўленасцямі. Групы па лініі Міністэрства энергетыкі працуюць па гэтай тэме, яны павінны ў адпаведнасці з рашэннямі, якія былі прынятыя ў рамках работы групы высокага ўзроўню, падрыхтаваць прапановы да 30 красавіка.

На нарадзе таксама ўздымалася пытанне, звязанае з некаторымі аспектамі падатковага манеўру. Абмяркоўвалася пытанне па транспартаванні нафты па тэрыторыі нашай краіны. Так, дзеючы нафтаправод мае патрэбу ў дадатковым рэгламентным абслугоўванні, паколькі эксплуатуецца працяглы час. Па словах Ігара Петрышэнкі, тэхнічныя спецыялісты пацвердзілі, што нафтаправод неабходна было закрыць на рамонтныя і рэгламентныя работы яшчэ паўтара года таму, аднак, каб не падводзіць партнёраў, было прынята рашэнне прымаць меры ў працэсе функцыянавання, без перапынкаў. Аднак цяпер, у сувязі з падыходамі, звязанымі з экалогіяй, элементамі зялёнай эканомікі, стала зразумела, што некаторыя рэчы нельга рэалізаваць без абмежаванняў або перакрыццяў.

Віцэ-прэм'ер выказаў надзею, што пытанні, звязаныя з рашэннем усіх іншых момантаў, у прыватнасці са здыманнем бар'ераў і абмежаванняў па пастаўках харчовай прадукцыі, будуць вырашаны.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## ПРА СЯБЕ І ПРА СУСЕДЗЯЎ

**гаварылася падчас сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Малдовы Ігарам Дадонам.**

«Вельмі шмат пытанняў, якія мы павінны абмеркаваць, вакол нас. Натуральна, і нашы адносіны, Малдовы і Беларусі. Я вельмі спадзяюся, што праблем у гэтых адносінах няма і быць не павінна. Таму што мы патрэбныя адзін аднаму, мы пра гэта дамовіліся. І сённяшняя сустрэча (хай яна будзе кароткай, але вельмі важна, што мы сустрэліся) будзе дадатковым імпульсам нашым адносінам. Я так бачу гэтую сустрэчу», — сказаў беларускі лідар.

Абмеркавалі і міжнародны парадак дня. «Нашы погляды ўвогуле супадаюць, але тым не менш столькі падзей. Асабліва ў нашых суседзяў, якія знаходзяцца паміж намі, — велізарная, цудоўная краіна Украіна. Думаю, у вас свой пункт гледжання па сітуацыі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мяне апошнім часам папракаюць... Вы, напэўна, заўважылі, што я занадта часта кажу пра Украіну, але як інакш: наша краіна блізкая».

Безумоўна, закранулі і беларуска-расійскія адносіны.

У сваю чаргу Ігар Дадон адзначыў, што паміж Беларуссю і Малдовай склаліся сяброўскія адносіны. Паводле слоў Прэзідэнта Малдовы, тое, што робіцца ў Беларусі ў многіх сектарах, не толькі ў эканоміцы, можа быць прыкладам для яго краіны. «Вядома, нявырашаных пытанняў у нашых двухбаковых адносінах няма. Трэба дапрацаваць усё, што датычыцца гандлю», — дадаў ён.

Асобна лідар гэтай краіны выказаўся пра сітуацыю ва Украіне: «Мы спадзяёмся, што ва Украіне ўсё будзе добра, стабільна. Гэта ў нашых інтарэсах. Таму што мы праз Украіну пастаўляем даволі вялікую частку нашых тавараў у Расію і іншыя краіны СНД. Для нас вельмі важна, што будзе там адбывацца. Больш за тое, украінская дыяспара ў Малдове — самая вялікая».

**Паводле БелТА.**

Пасутнасці

# КАНФЛІКТ ВАКОЛ ЧЫРВОНАГА ВЫРАШАНЫ НА 99 %

## Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта даручыла канчаткова ўрэгуляваць спрэчку пра возера

**Колькі месяцаў таму ў Жыткавіцкім і Петрыкаўскім раёнах Гомельскай вобласці стала нарастаць канфліктная сітуацыя — з'явілася інфармацыя пра планы цалкам аддаць возера Чырвонае ў распараджэнне Нацпарка «Прыпяцкі». Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА наведала палескі рэгіён. Рабочая паездка таксама была звязана з неабходнасцю кантролю выканання даручэнняў Аляксандра Лукашэнкі, дадзеных падчас папярэдніх камандзіровак.**



Фота БелТА.

Наталля Качанава прыняла ўдзел у пазачарговым пасяджэнні выканкама ў Жыткавічах. Кіраўнік Адміністрацыі вызначыла галоўную недапрацоўку: узнятая шуміха часткова стала вынікам недастатковага інфармавання грамадзян уладай.

На пытанне, наколькі абаронены інтарэсы бакоў, асабліва мясцовых жыхароў, Наталля Качанава адказала: «Я ў гэтым упэўнена. У правільным полі ўсе пытанні ўрэгулявання. Зараз патрэбна проста гэта ўсё разам абагульніць і данесці да тых людзей, у якіх яшчэ маюцца пытанні».

Кіраўнік Адміністрацыі падкрэсліла, што ўсе рашэнні павінны прымацца на карысць дзяржавы, а прыродныя багацці неабходна выкарыстаць так, каб захаваць іх і для будучых пакаленняў.

На пасяджэнні мясцовыя ўлады атрымалі дакладныя даручэнні: навесці парадак на ўсіх тэрыторыях, вызначыць цану пуцёвак для мясцовых жыхароў і замежных турыстаў. У сваю чаргу старшыня райвыканкама завярыў, што канфлікт вырашаны на 99 %, будуць урэгуляваныя і астатнія пытанні. «Трэба вырашыць на 100 %», — рэзюмавала Наталля Качанава.

**Старшыня Жыткавіцкага райвыканкама Віктар АТЛІВАНАЎ** паведаміў, што пратакол даручэнняў Прэзідэнта, дадзеных падчас наведвання раёна летась, выкананы на 90 %. Наталля Качанава нагадала пра патрабаванне кіраўніка краіны ўсюды шукаць новыя перспектыўныя кірункі дзейнасці.

Яшчэ адзін акцэнт — на рабоце з насельніцтвам. У прыярытэце павінны быць калектыўныя звароты і тыя, што адрасаваны ў вышэйшыя інстанцыі, падкрэсліла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Яна таксама азнаёмілася з сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй у аграгарадку Ляскавічы, звярнула ўвагу на некаторыя недаробкі ў навядзенні парадку і ўтрыманні рамонтна-механічнай майстэрні ААТ «Агра-Ляскавічы», высока ацаніла прадукцыю дрэваапрацоўчага комплексу «Ляскавічы», азнаёмілася з турыстычнымі аб'ектамі рэгіёна.

Пасля пасяджэння Наталля Качанава наведала ААТ «Людзяневічы» і адзначыла гаспадарскі падыход да ўтрымання фермы. Да мехдвара і рамонтнай майстэрні — зноў заўвагі. І на гэтым, і на іншых аб'ектах кіраўнік Адміністрацыі перш за ўсё звяртала ўвагу на неабходнасць няўхільна выконваць патрабаванне Прэзідэнта пра паўсюдное навядзенне парадку.

**Паводле БелТА.**

## АЎТО З ІЛЬГОТАМІ

**Дзяржава будзе кампенсаваць інвалідам і шматдзетным сем'ям 50 % мытных пошлін пры ўвозе легкавога аўто.**

Гэта прадугледжана Указам № 140 «Аб кампенсацыі мытных пошлін, падаткаў», які падпісаў Аляксандр Лукашэнка. Такім чынам, для асоб, якія маюць інваліднасць I альбо II групы, а таксама для шматдзетных сем'яў прадугледжана кампенсацыя з рэспубліканскага бюджэту 50 % мытных пошлін, падаткаў, якія падлягаюць выплаце пры ўвозе на тэрыторыю нашай краіны аднаго легкавога аўтамабіля на працягу года.

**Паводле БелТА.**

Парламенцкі дзённік

# На службе якасці

## Не змаглі самаарганізавацца — альтэрнатыву прапануе дзяржава

**Змяненні ў закон «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг» у першым чытанні разглядалі на чарговым пасяджэнні ў Палаце прадстаўнікоў. Новаўвядзенне замацоўвае паняцце «дзяржаўная служба заказчыка». Гэта ўпаўнаважаная асоба будзе прафесійна наглядаць за аб'ёмам паслуг і якасцю работ. Згодна з механізмам спецыялісты дапамогуць спажыўцам адстойваць свае правы і законныя інтарэсы.**

Па словах **міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандра ЦЕРАХАВА** (ён далажыў аб законапраекце дэпутатам), у Мінску такія службы заказчыкаў ужо створаныя і будуць узбуйняцца.

«Сёння звароты паступаюць і з рэгіёнаў: людзі хочуць, каб у іх з'явіліся такія ж прафесійныя абаронцы. Так, магчыма ў Мінску служба не працуе ў поўным аб'ёме, як павінна. Таму мы і ўводзім паняцце абавязковай прафесійнай атэстацыі. Павінны з'явіцца сапраўдныя прафесіяналы, якія змогуць, абараняючы правы і інтарэсы жыхароў, дыктаваць умовы падрадным арганізацыям», — сказаў міністр.

Законапраект значна спросціць жыццё спажыўцам камунальных паслуг. Калі раней яны павінны былі мець некалькі дагавораў і самі наглядаць, ці памылі падлогу, як падрыхтавалі да зімы цеплавы вузел, то цяпер сачыць за гэтым будзе адна арганізацыя. Акрамя таго, яна абавязана даць карыстальніку ўсю неабходную інфармацыю — колькі грошай (у тым ліку бюджэтных) патрачана на пэўны жылы дом, як распарадзіліся сродкамі, якія атрымалі ад насельніцтва. Таксама служба заказчыкаў будзе вывучаць пажаданні і запыты жыхароў на новыя паслугі.

«Ёсць таварыства ўласнікаў, дзе выбралі, знайшлі старшыню (будзем абапіраца на станоўчы вопыт), які чуе кожнага чалавека. І мы задаліся пытаннем: чаму нельга стварыць такую ж альтэрнатыўную дзяржаўную арганізацыю, якая аналагічным чынам будзе чуць кожнага чалавека? Людзі не змаглі самаарганізавацца ў таварыства ўласнікаў, і прымушаць іх да гэтага не трэба. Але мы павінны захаваць агульную маёмасць, даць элементы кіравання, каб кожны чалавек, які плаціць па тарыфах за камунальныя паслугі, мог быць упэўнены, што яго дом захавае свае спажывецкія якасці», — расказвае пра ідэю Аляксандр Церахаў.

Новая служба не прывязана да падарання «камуналкі». Плата за яе паслугі будзе ўключана ў структуру існуючых тарыфаў.

Разглядалі ў першым чытанні і новаўвядзенні ў закон «Аб пахаванні і пахавальнай справе». Адно з самых важных змяненняў — забарона на пахаванне спосабам, які не апісаны ў законе. Напрыклад, у хуткім часе выканаць волю нябожчыка, які завяшчаў развеяць свой прах, будзе забаронена нормамі права.

Родныя Героя Беларусі, СССР, Сацыялістычнай Працы і кавалераў некаторых іншых ганаровых званняў атрымаюць магчымасць выбіраць: устанавіць за кошт дзяржавы надмагільнае збудаванне вызначанага ўзору ці зрабіць яго самастойна і потым атрымаць кампенсацыю.

Мясцовым Саветам дэпутатаў з улікам меркаванняў грамадзян, што пражываюць на пэўнай тэрыторыі, даецца магчымасць адкрыць раней закрытыя месцы пахавання.

Для ратыфікацыі дэпутатам прадставілі пагадненні ўрадаў Беларусі і КНР аб тэхніка-эканамічнай дапамозе. Згодна з імі кітайскія партнёры пабудуюць Нацыянальны футбольны стадыён і басейн міжнароднага стандарту.

Праектаванне і будаўніцтва аб'ектаў будзе здзяйсняцца па кітайскіх стандартах і нормах без іх адаптацыі да дзеючых беларускіх. Але пры ўзвядзенні пабудоў падрадчык павінны прытрымлівацца патрабаванняў і рэкамендацый Міжнароднай федэрацыі плавання FINA для басейна і Міжнароднай федэрацыі футбола FIFA і UEFA для стадыёна.

Кітайскі бок дае неабходную тэхніку, абсталяванне, матэрыялы і персанал. Дапамога аказваецца на бязвыплатнай аснове.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# КРЫНІЧКА СКАЖА ДЗЯКУЙ!

**У вёсцы Пустынкі Мсціслаўскага раёна, што на Магілёўшчыне, БРСМ адкрывае чарговы сезон рэспубліканскага міжканфесіянальнага дабрачыннага праекта «Аднаўленне святынь. Крыніцы Беларусі».**

Цэнтрам увагі моладзі на гэты раз стаў Пустынскі Свята-Успенскі мужчынскі манастыр і адна з трох яго гаючых крыніц — Ефрасіннеўская. Плануецца ачысціць тэрыторыю манастыра і прылеглыя да яго землі ад апалай лістоты і сухастою, закласці сад з 75 пладовых дрэў і паставіць лаўкі. Што датычыцца крыніцы, то ёсць жаданне рэканструяваць лесвіцу, якая вядзе да яе, і зрабіць над святым калодзежам навес. А каб людзям было зручна браць з яго ваду, плануецца ўладкаваць каптажную камеру.

Нагадаем, што рэспубліканская акцыя «Аднаўленне святынь Беларусі» рэалізуецца ў краіне з 2013 года. За гэты час добраахвотнікі БРСМ добраўпарадкавалі каля 1355 культавых аб'ектаў. У Год малой радзімы вырашана зрабіць акцэнт на водных крыніцах.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## «Брэксіт» адкладзены да 31 кастрычніка



Еўрапейскі саюз на экстранным саміце даў Брытаніі, якая апынулася ў тупіку, адтэрміноўку выхаду з ЕС да 31 кастрычніка. У адваротным выпадку ў ноч на суботу Брытанію чакаў бы «жорсткі «брэксіт». Па ўмовах адтэрміноўкі Лондан можа не чакаць яе канца і фармальна выйсці з ЕС раней, калі Палата абшчын усё ж такі ратыфікуе тройчы адрынутае ёю пагадненне аб выхадзе з Еўрасаюза. У гэтым выпадку выхад Брытаніі адбудзецца ў першы дзень месяца, наступнага за тым, у які будзе ратыфікаваная дамова. «Гэта азначае дадатковыя шэсць месяцаў. Хачу звярнуцца да маіх брытанскіх сяброў: гэта дастатковы час, каб знайсці найлепшае рашэнне. Калі ласка, не выдаткуйце гэты час марна», — сказаў на прэс-канферэнцыі па выніках саміту старшыня Еўрапейскага савета Дональд Туск. Па словах Туска, на працягу гэтых шасці месяцаў Брытанія можа ратыфікаваць пагадненне аб выхадзе і выйсці з ЕС раней, чым у канцы кастрычніка, можа «перагледзець сваю стратэгію ў дачыненні да «брэксіту», а можа і зусім адкліканць апавяшчэнне аб выхадзе з Еўрасаюза, гэта значыць, адмяніць «брэксіт». Пры гэтым кіраўнік Еўрасавета не выключае, што выхад Брытаніі з ЕС прыйдзецца перанесці яшчэ раз.

## У Індыі праходзяць самыя маштабныя выбары ў гісторыі



Учора ў Індыі стартавалі парламенцкія выбары. Партыі будуць змагацца за 543 крэслы ў Лок Сабха — ніжняй палаце індыйскага парламента. Тая партыя, якая атрымае 272 або больш месцаў, зможа сфарміраваць урад, а яе лідар стане прэм'ер-міністрам краіны. Дзеючы прэм'ер Нарэндра Модзі, які ўзначальвае кіруючую «Індыйскую народную партыю» («Бхаратыя джаната парты»), паспрабуе паўтарыць поспех 2014 года. Перад мінулымі выбарамі Модзі абяцаў зрабіць Індыю эканамічнай і ваеннай звышдзяржавай. Сапернік цяперашняга прэм'ера — Рахул Гандзі, унук Індзіры Гандзі, які ўзначальвае апазіцыйны «Індыйскі нацыянальны кангрэс». Правам голасу валодае каля 900 мільёнаў чалавек. У штаце Выбарчай камісіі Індыі каля 300 чалавек. Каб ахапіць усіх выбаршчыкаў, уладам краіны прыйшлося прыцягнуць больш за 10 мільёнаў чалавек.

## Заснавальнік WikiLeaks Джуліян Асанж арыштаваны

Паліцыя Лондана затрымала заснавальніка WikiLeaks Джуліяна Асанжа пасля таго, як Эквадор адмовіўся даваць яму прытулак у сваім пасольстве, дзе ён хаваўся сем гадоў. Па паведамленні Скотланд-Ярда, услед за затрыманнем Асанж быў арыштаваны ў сувязі з запытам на экстрадыцыю з боку ЗША. Сам Асанж раней заяўляў, што яго праследуюць па палітычных матывах, гэта можа прывесці да выдачы яго ў ЗША за публікацыю ў 2010 годзе сакрэтных ваенных дакументаў і дыпламатычнай пошты. Прэзідэнт Эквадора Ленін Марэна адзначыў, што заснавальнік WikiLeaks неадназова парушаў міжнародных канвенцыі. «Непаважлівыя і агрэсіўныя паводзіны Асанжа, варожыя і пагрозлівыя заявы з боку дружалюбных яму арганізацый на адрас Эквадора і асабліва парушэнне міжнародных дагавораў прывялі да сітуацыі, калі даванне прыстанішча Асанжу непрымальнае і немагчымае», — заявіў Марэна. WikiLeaks напісала ў сваім «Твітэры», што Эквадор дзейнічаў незаконна, «у парушэнне міжнароднага права». У арганізацыі таксама адзначылі, што пасол Эквадора сам запрасіў брытанскую паліцыю ў будынак дыпмісіі, пасля чаго Асанж быў адразу ж затрыманы.



Блізкая ўлада

# ДА КАНЧАТКОВАГА ВЫРАШЭННЯ

**Вырашэнне пытанняў, якія грамадзяне накіроўвалі для «Вялікай размовы», кантралюецца да самага іх выканання.**

Пра гэта заявіў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый МІЦКЕВІЧ** на прыёме грамадзян і юрыдычных асоб у Смалявіцкім раёне. Паводле яго слоў, што датычыцца гэтага раёна, то было шэсць зваротаў. Частка з іх знаходзіцца ў стадыі рашэння.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што тэрміны выканання ў кожнай асобнай сітуацыі розныя — аднак іх трэба ўсё роўна выконваць. Напрыклад, для асфальтавання дарогі трэба прадугледзець выдзяленне сродкаў з бюджэту.

На прыём да Валерыя Міцкевіча запісалася каля 30 чалавек — і гэта не толькі людзі з гэтага раёна, але і са сталіцы, Мінскай і нават Гродзенскай абласцей, Віцебска. Якія тэмы абмяркоўваліся? Жыллёвае будаўніцтва, добраўпарадкаванне, якасць паслуг ЖКГ, асвятленне населеных пунктаў, зямельныя і працоўныя спрэчкі, дзейнасць фермерскіх гаспадарак, таварыстваў уласнікаў, будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы Нацыянальнага аэрапорта і звязанае з гэтым адсяленне жыхароў суседняй вёскі.

У пачатку наступнага тыдня выязныя прыёмы працягнуцца. 16 красавіка, у аўторак, **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ** з 11 гадзін будзе праводзіць прыём у Глускім райвыканкаме, **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Віталь ВОЎК** будзе ў гэты ж час працаваць у Расонскім райвыканкаме, а **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Іван ЛАЎРЫНОВІЧ** у той жа дзень з 11 да 12 гадзін правядзе прамую тэлефонную лінію, а з 12.00 пачне прыём грамадзян.

**Паводле БелТА.**

## РАЗМОВЫ ПА СПРАВЕ

**Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 13 красавіка ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. У суботу на званкі з 9.00 да 12.00 адкажуць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Валерый Васілевіч РАБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

# Кніжная вясёлка



**Літаратурны парад казачных герояў, знаёмствы з сучаснымі пісьменнікамі, музыка з кінафільмаў, знятых па кнігах, і інтэрактыўныя падарожжы па старонках. Усё гэта і шмат чаго іншага чакае ў суботу 13 красавіка гасцей Міжрэгіянальнага фестывалю «PROдвижение кніг. Бібліятэчныя прыступкі», які адбудзецца ў пасёлку Карэлічы, што на Гродзеншчыне.**

— Мэта фестывалю — падтрымка цікаўнасці да кнігі і прапаганда чытання як культурнага працэсу, — кажа **Лілія АРЦЮХ, дырэктар Карэліцкай раённай бібліятэкі.** — Мы хочам пазнаёміць чытача з беларускімі пісьменнікамі і выдавецтвамі. А для нас як бібліятэкараў гэта яшчэ і абмен вопытам.

На фестываль з'едуцца, як мяркуецца, прадстаўнікі бібліятэк Гродзенскай вобласці з Дзятлава, Навагрудка, Воранава, Ваўкавыска, а таксама са Стоўбцаў і Баранавіч.

Свае творы на фестывалі прэзентуюць сучасныя беларускія літаратурныя мастакі. Пісьменніца Валерыя Фамінова з выдавецтва «Рэгістр» абяцала праспяваць для прысутных, а Міхась Лучыцкі, аўтар ваенна-прыгодніцкіх раманаў, мяркуе далучыць чытачоў да квэст-гульні. Малады аўтар Выдавецкага дома «Звязда» Павел Гушынец раскажа пра сваю кнігу «Дзяўчынка і кракадзіл», а Віктар Шніп, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура», распавядзе пра кніжныя навінкі.

— Нават у век інфармацыйных тэхналогій кніга займае, як і раней, лідзіруючае становішча сярод іншых носьбітаў інфармацыі, — упэўнена дырэктар карэліцкай бібліятэкі.

**Ірына СІДАРОК.**

# ТАКІ БЛІЗКІ КОСМАС

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## Складанасці здараюцца

Далей мы ідзём у аддзел планавання мэтавага прымянення. Тлумачым: прадпрыемства атрымлівае заяўкі на тэрыторыі, якія трэба сфатаграфаваць. У гэты аддзел паступаюць пачатковыя ўмовы, напрыклад, траекторыя палёту, пасля чаго спецыялісты вывучаюць, калі атрымаецца зняць патрэбную тэрыторыю. Робіцца прагноз надвор'я на час пралёту — калі яно дазваляе, то плануецца здымка з усімі параметрамі.

Дарэчы, а што трэба рабіць, калі на спадарожніку раптам нешта перастала працаваць? Такія сітуацыі прадугледжаны: апарат пяройдзе ў бяспечны рэжым — рэжым сонечнай арыентацыі, гэта значыць, павернецца «спіной» да сонца, адключыць усе праграмы і будзе зараджаць усе батарэі да максімуму. Пасля чаго ён чакае каманду, пакуль у камандным цэнтры вырашаюць, што рабіць, — напрыклад, пераканфігураваць абсталяванне. Дарэчы, гэта звычайная практыка, адзначыў Васіль Сівуха.

## На самым версе

Аб самой антэне на даху будынка расказаў **начальнік аддзела прыёму даных Сяргей НЕСЦЯРОНАК.** Крыху тэорыі: падчас сеанса сувязі спадарожнік рухаецца па пэўнай траекторыі, пачатковы пункт сеанса вызначаецца з дапамогай складаных разлікаў, антэна наводзіцца ў гэты пункт, а затым павінна суправаджаць апарат да заканчэння сеанса. Антэна прымае сігнал, які апрацоўваецца, дэкадзіруецца і фарміруецца ў пэўны файл. Дарэчы, прадпрыемства таксама прымае інфармацыю і з агульнадаступных метэаралагічных спадарожнікаў. Гэтая інфармацыя выкарыстоўваецца для фарміравання прагнозу надвор'я, а таксама — для пошуку цеплавых анамалій — напрыклад пажараў.

«Цяпер ідзе канструктарская работа па стварэнні сістэмы, якая будзе адсочваць усе цеплавыя анамаліі ў Беларусі і перадаваць іх у МНС. Гэта наша распрацоўка», — пракаментаваў спецыяліст.

Мы падняліся на дах. Масіўная антэна (яе маса 14 тон) была створана маскоўскай кампаніяй, расіяне таксама вырабілі сістэму кіравання і мадэрнізавалі яе ў 2016 годзе (да 2026 года павінна адпрацаваць). Кіруецца антэна пяццю рухавікамі, якія паварочваюць яе на працягу часу сеанса на вугал каля 180 градусаў такім чынам, каб яна не «страціла» спадарожнік, захоплены ў момант пачатку працэсу.

## Зрабі сам

Мала проста атрымаць інфармацыю са спадарожніка, яе яшчэ трэба сабраць разам. «Ёсць некалькі ўзроўняў апрацоўкі касмічных здымкаў. Па сутнасці, спачатку — гэта проста набор мікракадраў, а вось з дапамогай адмысловага праграмнага забеспячэння для апрацоўкі гэты набор ператвараецца ў канчатковы прадукт — здымак», — растлумачыў Васіль Сівуха, калі паказваў нам аддзел апрацоўкі даных.

Некаторым спажыўцам патрэбныя больш высокія ўзроўні апрацоўкі. Дарэчы, самы высокі ўзровень — ортафотатрансфармаваныя малюнкі, ужо накладзеныя на рэльеф мясцовасці і прывязаныя па пунктах на Зямлі з вялікай дакладнасцю. Усё залежыць ад запыту заказчыка, — як ён захоча, так на прадпрыемстве і зробяць.

## Аб тэхніцы і штучным інтэлекце

У цэлым, як можна ацаніць тэхнічны ўзровень прадпрыемства? Як расказаў **намеснік дырэктара НІРУП «Геаінфармацыйныя сістэмы» па навуковай рабоце, кандыдат тэхнічных навук Барыс ЧАРНУХА,** тэхнічны ўзровень беларускай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання адпавядае сусветнаму, айчынная сістэма разлічана на даванне спажыўцам касмічнай інфармацыі з раздзяленнем 2,1 метра для чорна-белых і 10,5 метра — для каляровых малюнкаў.

На пяткі чалавечым магчымасцям — асабліва ў сферы высокіх тэхналогій — наступае штучны інтэлект. Магчыма, хутка патрэба ў чалавеку пры апрацоўцы касмічнай інфармацыі адпадзе? «Размовы пра замену нашых супрацоўнікаў на нейкія прадукты, якія адносяцца да сферы штучнага інтэлекту, цяпер не правамерныя. Не толькі ў сілу спецыфікі работы — я пакуль не ведаю такіх дасягненняў штучнага інтэлекту, якія дазволілі б нават абмяркоўваць магчымасць замены нашых спецыялістаў», — адказаў вучоны.



## Касмічная пасяўная

Заказчыкамі матэрыялаў аэракасмічнага дыстанцыйнага зандзіравання выступаюць розныя ведамствы (іх, дарэчы, 11). У якіх сферах гэтыя матэрыялы могуць прынесці найбольшую карысць? На думку намесніка дырэктара па навуковай рабоце, усё залежыць ад таго, наколькі тыя ці іншыя арганізацыі і ведамствы гатовыя працаваць з касмічнай інфармацыяй. Тут шмат нюансаў — ад наяўнасці спецыялістаў да патрэбнага абсталявання. Яшчэ, упэўнены спецыяліст, у ведамствах патрэбныя лідары, якія збяруць вакол сябе каманду, каб перайсці да новай тэхналогіі работы гэтага ведамства, заснаванай на выкарыстанні касмічнай інфармацыі.

«Калі такіх людзей няма, то мы можам стукацца ў гэтыя ведамствы, расказваць ім, як выдатна магло б у іх быць, якая ў нас добрая інфармацыя. Але гэта, што называецца, ілбом аб сцяну, — сказаў Барыс Чарнуха. — Калі ёсць у ведамствах людзі, якія разумеюць перспектыву такога супрацоўніцтва, — вось там яно развіваецца. Я магу сказаць, што ў Беларусі цяпер найбольш паспяхова і эфектыўна касмічная інфармацыя выкарыстоўваецца ў МНС, Дзяржаўным камітэце па маёмасці, Белгідрамеце, Міністэрстве лясной гаспадаркі, некаторых сілавых ведамствах».

Напрошваецца пытанне — ідзе пасяўная, хіба здымкі з космасу не могуць дапамагчы паспяховай барацьбе за ўраджай? «На жаль, нельга сказаць, што з Міністэрствам сельскай гаспадаркі ёсць такі ўзровень супрацоўніцтва, як з іншымі ведамствамі, у сілу розных абставін», — дадаў суразмоўнік «Звязды».

Начальнік цэнтра Васіль Сівуха пры гэтым нагадаў, што функцыя прагнозу ўраджайнасці ўскладзена на Белгідрамет. НІРУП «Геаінфармацыйныя сістэмы» ў свой час распрацавала і перадало ў Белгідрамет спецыяльнае праграмнае забеспячэнне для такога прагназавання, а цяпер у рамках супрацоўніцтва перадае неабходныя здымкі. Дарэчы, паводле яго слоў, гэты прагноз штогод пацвярджаецца больш чым на 80 %.

## ЗША цікавіліся Непалам

Якія буйныя замежныя заказчыкі звяртаюцца да арганізацыі? Напрыклад, каля чатырох гадоў таму да арганізацыі звярнулася адна з кампаній са Злучаных Штатаў Амерыкі з просьбай сфатаграфаваць пэўную тэрыторыю Непала. З чым звязаны такі дзіўны для абывацеля заказ з краіны — сусветнага лідара ў касмічнай галіне? Барыс Чарнуха нагадаў простую ісціну: спадарожнік можа здымаць толькі там, дзе ён у пэўны момант ляціць. Калі ў краіны ёсць неабходнасць у здымцы канкрэтнай тэрыторыі, але яе спадарожнікі там у патрэбны момант не пралятаюць, тады лагічна звярнуцца да калег, чый спадарожнік ляціць над патрэбнай часткай планеты. Такім чынам, практыка ўзаемнага абмену паслугамі ў гэтай сферы распаўсюджана шырока. Дарэчы, Непал сфатаграфаваць было даволі складана з-за няпростых умоў надвор'я.

## Аб Карпатах і Чарнобылі

Існуе Міжнародная хартыя па маніторынгу і прадухіленні надзвычайных сітуацый, яна аб'ядноўвае мноства краін. Калі здараецца нейкая катастрофа глабальнага маштабу, то Хартыя прыцягвае для маніторынгу развіцця падзей усе даступныя сродкі сваіх удзельнікаў. Ад Беларусі ў Хартыю ўваходзіць наша МНС, а забеспячэнне касмічнай інфармацыяй ажыццяўляецца праз «Геаінфармацыйныя сістэмы», паколькі гэтая структура з'яўляецца Нацыянальным аператарам Беларускай касмічнай сістэмы ДЗЗ.

У гэтай сувязі становіцца важным маніторынг сумежных тэрыторый. Можна спрагназаваць надзвычайныя сітуацыі, якія потым адбудуцца на тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, Прыпяцкі водны басейн мае прытокі, якія цякуць з поўдня, з Украіны і бяруць пачатак у Карпатах. Касмічная інфармацыя аб стане снежнага покрыва ў Карпатах аказваецца карыснай пры прагназаванні магчымых паводак у нас на Палессі.

Іншы прыклад: лясны пажар у Чарнобылі ў 2015 годзе, які доўгі час не пацвярджаў украінскі бок. «А мы яго выявілі досыць аператыўна, пачалі інфармаваць і па лініі МНС, праз СМІ. Удалося хутка прыняць меры, для Беларусі гэты пажар ніякіх негатыўных наступстваў не меў», — расказвае Барыс Чарнуха.

## Цягнем-пацягнем усе галіны

Трэба разумець, што кошт стварэння і эксплуатацыі касмічных сістэм дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі досыць высокі. Беларуская сістэма не выключэнне. Ці атрымліваецца акупіць яе дзейнасць? Па словах намесніка дырэктара па навуковай рабоце, у непілатуемай касманаўтыцы, існуе тры асноўныя кірункі — дыстанцыйнае зандзіраванне Зямлі, рух і касмічная сувязь. Дык вось, трэцяе і — часткова — другое з'яўляюцца камерцыйна выгаднымі, паколькі маецца цікавасць інвестараў.

Дыстанцыйнае зандзіраванне Зямлі з космасу звычайна адносяць да датацыйных кірункаў. Аднак стварэнне касмічнай тэхнікі ДЗЗ патрабуе найноўшых тэхнічных рашэнняў, таму для іх дасягнення падцягваюцца ўсе сумежныя галіны.

Што датычыцца грашовага пытання, то для ацэнкі эфектыўнасці ўкладання грошай у навукова-тэхнічную дзейнасць у нашай краіне ёсць спецыяльныя методыкі. У адпаведнасці з імі, ацэнка эфектыўнасці такіх работ ідзе па комплексным прынцыпе, які прадугледжвае, што ўсе выдаткі на стварэнне сістэмы і яе эксплуатацыю параўноўваюцца з даходамі ад выкарыстання навукова-тэхнічных рашэнняў, атрыманых пры стварэнні касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання зямлі, за кошт стварэння новай прадукцыі і паслуг на аснове гэтых рашэнняў.

«Калі казаць канкрэтна, тыя рашэнні, якія былі распрацаваны пры стварэнні беларускай касмічнай сістэмы, пазней былі пакладзены ў аснову розных праектаў, у тым ліку ў праграмах Саюзнай дзяржавы, камерцыйных кантрактах. Дык вось, такая комплексная ацэнка на сёння паказвае перавышэнне даходаў над выдаткамі больш чым на 18 мільёнаў долараў. Яшчэ адзін паказчык — умоўнае імпартазамяшчэнне ад давання здымкаў беларускім спажыўцам — перавысіў 15 мільёнаў долараў», — расказаў Барыс Чарнуха.

## Як доўга яшчэ палятае?

Беларускі касмічны апарат быў уведзены ў эксплуатацыю ў 2012 годзе і лятае без малога сем гадоў. Наколькі ён тэхналагічны сёння — і калі будзе выведзены з арбіты?

«Мы разам з прадпрыемствам-вытворцам пастаянна маніторым яго тэхнічны стан. Ён — калі казаць простай мовай — увесь абчэплены рознымі датчыкамі, якія дазваляюць ацэньваць яго асноўныя тэхнічныя сістэмы, — расказаў намеснік дырэктара па навуковай рабоце. — Гэта значыць, можна ўбачыць, ці існуе дэградацыя параметраў, якая яе хуткасць. На аснове такога аналізу мы робім прагноз аб магчымай працягласці працаздольнасці спадарожніка».

Працэсы, якія патэнцыйна могуць прывесці да выхаду спадарожніка са строю, вядомыя — і іх не так шмат. Гэта тое, што звязана з падтрыманнем арбіты, з забеспячэннем аптымальных умоў для здымкаў.

Яшчэ адзін фактар — уздзеянне касмічнага выпраменьвання, асабліва цяжкіх часціц. Напрыклад, пры пападанні яны спрыяюць дэградацыі панэляў сонечных батарэй спадарожніка. Гэта значыць, могуць змяншацца выхадныя токі такіх батарэй, якія зараджаюць хімічныя акумулятары. Цяжкія часціцы ўплываюць і на фотапрыёмныя матрыцы, якія фарміруюць выяву ў аптычнай сістэме.

Адсочваючы хуткасць дэградацыі асноўных элементаў, можна спрагназаваць, колькі апарат будзе працаваць. «Цяпер прынята такое рашэнне, што прагнозны тэрмін спадарожніка ацэньваецца да канца 2021 года», — праінфармаваў Барыс Чарнуха.

Да гэтага часу апарату будзе 9,5 года, а разліковы тэрмін эксплуатацыі — усяго пяць. Фактычна, двайны тэрмін. Гэта можна ацэньваць як нагоду для стварэння і выводу на арбіту яшчэ аднаго спадарожніка.

Што ўяўляе сабой вывад спадарожніка з эксплуатацыі? Ён будзе пераведзены з арбіты на траекторыю пахавання, будзе паступова зніжацца, пакуль не згарыць у атмасферы. Пакідаць непрацуючы спадарожнік на арбіце нельга — цяпер вельмі актуальнай з'яўляецца праблема касмічнага смецця. У сістэме стандартаў Еўрапейскага касмічнага агенцтва — там, дзе апісваецца жыццёвы цыкл вырабаў для космасу, — як абавязковы прапісаны этап утылізацыі, выводу з арбіты і пахавання абсталявання.

## А там — і новы пачатак

Дарэчы, «Геаінфармацыйныя сістэмы» з'яўляюцца непасрэдным удзельнікам распрацоўкі новага беларуска-расійскага спадарожніка. «Цяпер ажыццяўляецца этап эскізнага праектавання, у рамках якога разліковым шляхам, шляхам разнастайнага мадэлявання ўдакладняюцца тэхнічныя параметры новага апарата і сістэмы ў цэлым, кошт, тэрміны распрацоўкі. Этап эскізнага праектавання заканчваецца ў канцы 2019 года. Пакуль арыенціровачны тэрмін яго вываду на арбіту — 2023 год», — расказаў вучоны.

Такім чынам, паміж заканчэннем планавага тэрміну работы дзеючага беларускага спадарожніка — канец 2021 года, і запускам новага — у 2023-м, больш за год. Дзе будуць браць інфармацыю беларускія спажыўцы?

«Наша сістэма забяспечвае заказчыкаў здымкамі не толькі з Беларускага касмічнага апарата. Ён працуе ў складзе арбітальнай групоўкі аналагічных расійскіх спадарожнікаў. Ужо дасягнуты пагадненні аб уключэнні ў склад гэтай групоўкі расійскіх спадарожнікаў, аналагічных таму, які быў у свой час запушчаны разам з нашым — гэта спадарожнік серыі «Канопус», — растлумачыў Нацыянальны аператар ДЗЗ.

Калі беларускі спадарожнік перастане існаваць, то Беларусь мае магчымасць прымаць інфармацыю з «Канопусаў». Акрамя таго, на прадпрыемстве прымаюць інфармацыю з вялікай колькасці агульнадаступных спадарожнікаў. Зараз сродкі беларускай касмічнай сістэмы дапрацоўваюцца для прыёму інфармацыі з гэтых апаратаў і перадачы яе заказчыкам. Гэтыя меры дазваляюць спадзявацца, што беларускія спажыўцы касмічных здымкаў не адчуюць інфармацыйнага вакууму да ўвядзення ў эксплуатацыю новага спадарожніка.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**




## ЦІ САВОЙ АБ ПЕНЬ, ЦІ ПНЁМ АБ САВУ

Чытаеш рубрыку «...Народ на провадзе!», і самому хочацца нешта расказаць.

Некалі, у першай палове 1960-х гадоў, не было ў нашай вёсцы ніякіх тэлевізараў, дзеці ўвесь свой час праводзілі на вуліцы. Зімой гулялі ў снежкі, каталіся на санках, на лыжах, а ўжо летам...

У нас было рукою падаць да рэчкі, да возера, трохі паводдаль — лес. А значыць, купайся, лаві сабе рыбу, хадзі ў ягады і грыбы!

Гэта, вядома ж, прыемныя занятак. Але больш за ўсё мы любілі іншы. Дарогі былі, можна сказаць, пустыя, машын — амаль што ніякіх. Значыць, садзіся на ровар, гойсай і нічога не бойся... Хіба што кола, якое спусціць.

Каб напампаваць яго, патрабаваўся адмысловы — як у нас казалі — вэнталь. У мяне, на жаль, яго не было. А таму, калі тата (светлай памяці!) па нейкіх справах сабраўся ў Паставы, я папрасіў, каб прывёз. Адзінае... Мне, малому, тады здавалася, што Паставы — гэта вельмі вялікі горад, і ўсе там размаўляюць па-гарадскому — па-руску. Значыць, нашага вэнталя могуць і не знаць? Я папытаўся ў старэйшых хлопцаў, як ён называецца правільна. «Ніпель», — сказалі тыя, а я сказаў тату.

Праўда, ён, пакуль ехаў да горада ды ўладжваў там свае справы, слова гэта забыўся і ў краме папрасіў... фіцэлі.

— А што гэта? І для чаго? — здзівілася прадавачка.

— Ну, каб уставіць і потым пампаваць.

(Як — тата яшчэ і «на пальцах» паказаў).

Збоку гэта, мусіць, смешна выглядала, бо ўсе пакупнікі пакаціліся ад рогату. А потым, адсмяяўшыся, нейкі афіцэр (у той час у Паставах гарнізон стаяў) папрасіў прадаць яму ніпелі.

— Во-во... І мне таксама, — спахапіўся тата.

Карацей, з прыгодамі, але ён такі выканаў маю просьбу... Хоць потым і казаў, што прадавачка нідзе б не дзелася — зразумела б і нашы вэнталі, бо яно ж ці савой аб пень, ці пнём аб саву. Хіба не так?

**Пятро Харэцкі,**
*г. Мінск.*

## ХАЙ БУДЗЕ І... БАЙЦЗЮ

Што ні край, то звычай, не кажучы ўжо пра мову... А таму нашы турыстыпадарожнікі, выязджаючы за межы краіны, у няёмкае становішча трапляюць часта. Максім Танк у адным з вершаў расказваў, як у Балгарыі дзеўка падавала суп таратор, як спытала ў едака, ці спадабаўся? Наш чалавек кіўнуў галавой: маўляў, вельмі — смачна так, што за вушы не адцягнеш! А яна — чамусьці засмуцілася. Спытаў потым, ці прыйдзе на сустрэчу? Яна таксама згодна кіўнула і... не прыйшла, бо наш ківок згоды (ён потым даведаўся) па-балгарску «гучыць» як адмова... І наадварот.

Пра свае невясёлыя прыгоды расказваў некалі і гумарыст Задорнаў. У Амерыцы ў рэстаране ім падалі смажаную рыбу разам з налітым у невялічкія піялы кампотам (у ім яшчэ долькі апельсінаў плавалі). «Гэта — каб потым запіць», — вырашыў госць і нават выпрыхлаўся... А сябра — спыніў, сказаў, што ў піяле зусім не кампот, што да рыбных страў там падаюць пасудзінкі з вадой (долькі апельсіну ў ёй — для водару), каб... спаласнуць потым пальцы.

Карацей, не так проста нашаму чалавеку за межамі. Як, дарэчы, і замежнікам тут, у нас. Я ад відавочцаў чуў пра кітайцаў, якія прыехалі будаваць электрападстанцыю.

Значыць, пасялілі іх у вагончыках побач з аб'ектам. У начальнікі прызначылі сваіх жа прарабаў, так што ў веданні моў рабочыя патрэбы не мелі, хіба...

Людзі ў нас, як вядома, гасцінныя. Дзядзька Франак, напрыклад, да тых кітайцаў прыгледзеўся ды і запрасіў іх у госці. На стол закускі нейкай наставіў, пляшку самагону прынёс — моцнага, чысцюткага. Вось толькі... Жонка напярэдадні нарыхтоўкі рабіла — скарыстала шмат воцату. Пустыя бутэлькі з-пад яго хацела выкінуць, але муж пераняў. Сказаў: «Навошта? Хай паслужаць яшчэ», а затым спаласнуў ды наліў гарэлкі.

Госці гэты прадукт, вядома ж, не зганьбілі: чаркі падымалі дружна, асушалі да дна, таму гаспадар час ад часу хадзіў па «дабаўку». І прыносіў — у бутэльках з-пад воцату.

Колькі іх выпілі, ніхто не лічыў, а калі і лічыў, — то ці збіўся, ці забыўся, бо расставаліся позна і, як выглядала, у добрым гуморы: абодва бакі былі задаволены! Кітайцы — тым, што «знутры» пагледзелі на тутэйшае жыццё, што добра пасядзелі. А гаспадар — дык яшчэ і слова з іхняй мовы запомніў — «байцзю». Было ў ім нешта тутэйшае — не тое ад нашага «бывай!», не тое ад «дзякуй!»...

Толькі назаўтра дзядзька даведаўся, што яго ўчарашнія госці зранку ўжо збегалі ў краму. Са словам «байцзю» пальцам паказвалі на адну з паліц ды працягвалі грошы. «За паўгадзіны ўвесь воцат размялі! Піць яго будуць, ці што?» — не разумела прадавачка.

Перакладчык потым сказаў (а яна ўжо і Франку...), што ў Кітаі гарэлку робяць з рысу і называецца яна байцзю.

...Так ці інакш, але гэтая назва прыжывацца стала і ў нас. Ва ўсякім разе ў дзядзькі Франка самагону цяпер ніхто і не просіць. Кажучь: «Будзь чалавекам: налі па чарцы байцзю!»

(«Каб ты воцату напіўся! Альбо смалы...» — жонкі ім жадаюць потым).

**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

## СМАЧНЫ БАБЕ АРЭХ...

| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 20 | 18 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | (87) | 10 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 598 | 685 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | - | - |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | - | - |

5. Среднесписочная численность работающих (человек) – 60.

6. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки – розничная торговля (включая алкогольные напитки и табачные изделия) и общественное питание.

7. **Дата проведения годового общего собрания акционеров**, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2018 год: 21.03.2019 года.

**Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности** ОАО «Торговый центр «Уручье» подготовлено 14 февраля 2019 года.

Аудит проведен Обществом с ограниченной ответственностью «Бейкер Тилли Бел», 220007, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Суражская, д. 10, пом. 4, зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета от 15.09.2004 года № 1906 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190565204, за период с 01.01.2018 года по 31.12.2018 года.

**Аудиторское мнение** с оговоркой:

Аудируемое лицо: Открытое акционерное общество «Торговый центр «Уручье», Республика Беларусь, 220141, г. Минск, ул. Руссиянова, д. 36, комн. 32, рег. № 101081643.

Мы провели аудит годовой бухгалтерской отчетности ОАО «Торговый центр «Уручье», состоящей из бухгалтерского баланса по состоянию на 31 декабря 2018 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, примечаний к бухгалтерской отчетности, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.

По нашему мнению, за исключением возможного влияния вопроса, описанного в разделе «Основания для выражения аудиторского мнения с оговоркой», прилагаемая годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Торговый центр «Уручье» по состоянию на 31 декабря 2018 года, финансовые результаты ее деятельности и изменения ее финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

8. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения: применялись.

9. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети интернет: нет.

Директор ОАО «ТОРГОВЫЙ ЦЕНТР «УРУЧЬЕ» Д. И. Ахремчик

Руководитель ООО «Белинтерпродукт»,
организации, оказывающей эмитенту услуги
по ведению бухгалтерского учета
и составлению бухгалтерской
и (или) финансовой отчетности Н. С. Шаблинская

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні вельмі пажадана будзе спачатку праверыць інфармацыю, а ўжо потым рабіць высновы. Інакш рызыкуеце наламаць дроў толькі таму, што нешта не так зразумелі. Добра было б стрымаць амбіцыі, і старайцеся не дапускаць негатыўных думак: ваша энергетыка будзе настолькі моцная, што яны могуць амаль матэрыялізавацца. У сераду ні ў якім разе не дазваляйце сабе рэзкіх ацэнак у адносінах да навакольных.

**ЦЯЛЕЦ.** Зможаце парадавацца сваім кар'ерным поспехам. Вы акружаны людзьмі, якія гатовыя шмат што зрабіць для вас і разам з вамі. У сераду спатрэбяцца такія якасці, як цярплівасць, стрыманасць і разважлівасць. Другая палова тыдня будзе больш спакойнай і гарманічнай.

**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні традыцыйны падыход да вырашэння праблем не заўсёды будзе ўдалым, магчыма, варта перагледзець некаторыя свае погляды. Даверцеся эмоцыям, дазвольце страсці вас захапіць. У справах варта абапірацца на розум, але ў каханні можна і галаву страціць, тым больш што вашы пачуцці ўзаемныя.

**РАК.** Найвышэйшыя сілы будуць падтрымліваць вас, памятайце пра гэта і давярайце сваёй інтуіцыі. У аўторак будзе вялікая спакуса каго-небудзь пакрытыкаваць, але лепш усё ж такі пахваліць. У сераду не ўвільвайце ад адказу, кажыце толькі тое, што вы сапраўды думаеце, у чым дакладна ўпэўнены. У нядзелю вы ўжо будзеце поўныя энергіі і гатовыя да новых прыгод.

**ЛЕЎ.** Цалкам магчыма, што прыйдзецца з галавой улезці не ў сваю справу, паколькі вы таксама зацікаўлены ў тым ці іншым яе зыходзе. Падрыхтуйцеся да таго, што давядзецца абараняць свае правы і тлумачыць, што вы ўвогуле тут робіце. У сераду і чацвер не выключаны канфлікты на працы і неразуменне ў сям'і. Праявіце цярпенне і такт. У пятніцу пастарайцеся завяршыць большую частку пачатых спраў.

**ДЗЕВА.** Тыдзень будзе напоўнены разнастайнымі падзеямі і прыемнымі сустрэчамі. Можа шмат у чым пашанцаваць, усё залежыць ад таго, да чаго вы імкняцеся ў дадзены момант. Не лянуйцеся, паспрабуйце раскрыць свой творчы патэнцыял. Калі ўзнікне пачуццё ўнутранага пратэсту, пажадана адмовіцца ад такой прапановы. Паспрабуйце не раздражняцца па дробязях, а ўпарта ісці наперад і рабіць сваю справу.

**ШАЛІ.** Не выключана расчараванне ў кім-небудзь з блізкіх людзей, але гэта не падстава для расстройства. Раптоўны званок, і вы ўжо ззяеце ад шчасця. Чацвер і пятніца — амаль ідэальныя дні для таго, каб заняцца падрыхтоўкай і рэалізацыяй сур'ёзных дзелавых планаў. Асабліва цікавыя ідэі могуць наведаць у пятніцу, паспрабуйце запісаць іх, каб не выпусціць з-пад увагі.

**СКАРПІЁН.** Удалы тыдзень, вы апынецеся ў патрэбны час у патрэбным месцы, добра папрацуеце і адчуеце эмацыянальны ўздым. У аўторак ці сераду магчымы важкі прыбытак ад сумеснага бізнесу з энергічнымі партнёрамі. Прысвяціце больш часу асабістаму жыццю, не бойцеся быць адкрытымі і прызнацца ў каханні, вас чакае нямала рамантычных і эратычных задавальненняў.

**СТРАЛЕЦ.** Каб дамагчыся поспеху, вам зараз проста неабходна дзелавыя амбіцыі. Вашы ініцыятывы падтрымаюць. Чацвер і пятніца — спрыяльны час для спакойнай і плённай працы. Удзяліце пабольш часу прафесіі і толькі выхадныя прысвяціце сабе. Паспрабуйце разабрацца са сваім унутраным светам.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні праявіце разумную асцярожнасць, маючы зносіны з партнёрамі па бізнесе. У панядзелак спатрэбіцца імгненная рэакцыя і ўменне хутка прымаць рашэнне, інакш рызыкуеце не паспець за падзеямі, якія развіваюцца вокамгненна. У сераду давядзецца адстойваць рэалістычнасць вашых планаў і задум перад начальствам. У чацвер добрыя навіны ўзбадзёраць, але варта праверыць іх дакладнасць. Пятніца — не зусім удалы дзень для падпісання дагавораў і кантрактаў. Выхадныя дні лепш правесці з сям'ёй або з сябрамі.

**ВАДАЛІЎ.** З'явіцца шанц прасоўвання па кар'ернай лесвіцы, але працаваць давядзецца шмат. Лепш за ўсё будуць вырашацца паўсядзённа-руцінныя пытанні. Нягледзячы на жаданне дзейнасці, якое апаноўвае вас, паспрабуйце ўтаймаваць сваю стараннасць, бо ў другой палове тыдня ўзрасце імавернасць памылак, самападману, з-за чаго рызыкуеце падарваць свой аўтарытэт. Выхадныя лепш правесці ў адзіноце і выспацца.

**РЫБЫ.** Вам неабходна на гэтым тыдні праявіць дыпламатычнасць і ўменне стрымліваць эмоцыі. Аднак у той жа час варта быць настойлівымі пры адстойванні сваіх інтарэсаў. Рабочая абстаноўка ў цэлым спакойная, што дазваляе злёгку расслабіцца. Нарэшце вы наведзяце парадак у паперах, добра будзе прасоўвацца работа з дакументамі. У выхадныя не ўзвальвайце на свае плечы лішні груз.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.17 | 20.05 | 13.48 |
| Віцебск — | 6.04 | 19.57 | 13.53 |
| Магілёў — | 6.07 | 19.55 | 13.48 |
| Гомель — | 6.06 | 19.49 | 13.43 |
| Гродна — | 6.32 | 20.20 | 13.48 |
| Брэст — | 6.36 | 20.17 | 13.41 |

### Месяц

*Першая квадра ў 22.05. Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

*Пр. Івана, Засімы, Сафрона. К. Віктара, Зянона, Юліяна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**«Канцэптуальна» — найлепшы заменнік слова «дрэнь», калі не хочаш пакрыўдзіць кагосьці сваёй ацэнкай яго творчасці.**

— Чаму я не магу знайсці каханую?

— Можа таму, што ты ўвесь час з ясенямі і тапалямі размаўляеш, а не спрабуеш з жанчынамі знаёміцца?..

**Жанчыны любяць разумных мужчын. Вось, напрыклад, калі ў мужчыны прыгожыя рукі, высокі рост, дужае цела і прыемны голас, то гэта разумны мужчына.**



caricatura.ru

## Даты | Падзеі | Людзі

### 12 КРАСАВІКА




**1890** год — нарадзіўся (вёска Шчорсы, цяпер у Навагрудскім раёне) Янка Нёманскі (Іван Андрэевіч Пятровіч), беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі (1928). У 1909 годзе скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, затым вучыўся ў Петраградскім універсітэце. З 1918 года працаваў у Беларускім нацыянальным камісарыяце, сумесна з Ц. Гартным рэдагаваў газету «Дзянніца». У 1919—1921 гадах быў у Чырвонай Арміі. З 1922 года працаваў у планава-эканамічных органах рэспублікі, быў намеснікам старшыні Дзяржплана БССР. У 1929—1931 гадах — неадменны сакратар Беларускай АН і адначасова вучоны сакратар Інстытута эканомікі НДІ прамысловасці. Браў удзел у рабоце Інбелкульта. Апублікаваў больш за 30 навуковых і літаратурных прац. Аўтар артыкулаў па пытаннях эканомікі, гісторыі і культуры Беларусі, а таксама рамана «Драпежнікі», аповесці «Партызан», апавяданняў. У 1937 годзе рэпрэсаваны і прысуджаны да выключнай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.

**1904** год — нарадзілася (вёска Обаль, цяпер у Сенненскім раёне) Соф'я Дзмітрыеўна Лі, беларускі жывапісец, заслужаны работнік культуры Беларусі. Працавала ў жанрах пейзажа, нацюрморта, тэматычнай карціны. Значная частка работ прысвечана тэме барацьбы беларускіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны: «Партызанскі лагер», «Партызаны ў дазоры», «Партызанская зямлянка» і інш. Сярод іншых работ: пейзажы «Восень», «Нарач», нацюрморты «Дзень Перамогі», «Макі» і інш. Для яе палотнаў характэрная кампазіцыйная дакладнасць, каларыстычная гучнасць, пластычная завершанасць. Памерла ў 1980 годзе.




*Сусветны дзень авіяцыі і касманаўтыкі (Міжнародны дзень палёту чалавека ў космас). Адзначаецца па рашэнні Міжнароднай авіяцыйнай федэрацыі (ФАІ). 12 красавіка 1961 года савецкі касманаўт Юрый Гагарын на касмічным караблі «Усход» упершыню ў свеце здзейсніў арбітальны аблёт Зямлі.*

**1839** год — нарадзіўся Мікалай Міхайлавіч Пржавальскі, рускі падарожнік, ганаровы член Пецярбургскай АН, генерал-маёр. Род Мікалая Міхайлавіча, па сведчаннях краязнаўцаў, паходзіць з Віцебшчыны. За 20 гадоў падарожжаў па Усурыйскім краі і Цэнтральнай Азіі Мікалай Пржавальскі прайшоў пешшу, на вярблюдах і конях шлях, амаль роўны даўжыні зямнога экватара. Сабраў каштоўныя калекцыі раслін і жывёл, упершыню апісаў дзікага вярблюда, дзікага каня, названага пазней імем вучонага, і іншыя віды пазваночных. Свае найвышэйшыя ўзнагароды яму прысудзілі ўсе вядучыя геаграфічныя таварыствы свету: Санкт-Пецярбурга, Вены, Парыжа, Берліна. Памёр у 1888 годзе.

**1879** год — амерыканскі вынаходнік Томас Эдысан атрымаў першы патэнт на радыёлямпу напальвання з плацінавай спіраллю.



**1912** год — нарадзіўся (г. Рэчыца Мінскай губерні) Яфім Захаравіч Капелян, савецкі акцёр, артыст Ленінградскага Вялікага драматычнага тэатра, народны артыст СССР. Здымаўся ў фільмах «Час, наперад!», «Мікалай Бауман», «Злачынства і кара», «Няўлоўныя мсціўцы», «Вечны ключ». Яго голас гучыць за кадрам «Сямнаццаці імгненняў вясны». Памёр у 1975 годзе.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1260.

Нумар падпісаны ў 19.30 11 красавіка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

12 красавіка 2019 г. № 15 (500)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# БОЛЬШ АРЭНДНАГА ЖЫЛЛЯ І РАЗВІЦЦЁ ГАРАДОЎ-СПАДАРОЖНІКАЎ

**КОЖНЫ год пастановай урада зацвярджаецца праграма будаўніцтва жылля на год. Згодна з ёй сёлета спецыялісты плануюць пабудаваць мінімум 4 мільёны квадратных метраў жылля. Урад падлічыў і колькі грамадзяне пабудуюць для сябе сваімі рукамі. Улады разлічваюць, што ў 2019-м людзі ўзвядуць 1 мільён 750 тысяч «квадратаў» прыватнага жылля. Прычым 800 тысяч з іх — у Мінскай вобласці.**

Спецыялісты шмат гаварылі аб неабходнасці даць новы штуршок развіццю гарадоў-спадарожнікаў. У выніку вырашана пабудаваць у такіх гарадах удвая больш, чым летась. На першым месцы стаяць Смалявічы, дзе хочуць узвесці тры панэльныя дамы для мінчан, у Рудзенску — 1–2 дамы, па будынку ў Заслаўі, Фаніпалі і Дзяржынску.

Прыкметнае змяненне ёсць у планах па будаўніцтве арэнднага жылля — калі ў 2018-м планавалі 90 тысяч квадратных метраў, то сёлета — больш за 135 тысяч «квадратаў». Будаваць масава хочуць у Гродзенскай вобласці (33,25 тысячы квадратных метраў), у Гомельскай (28,35 тысячы квадратных метраў) і Брэсцкай (26,25 тысячы квадратных метраў) абласцях.

**ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 3-й стар. «МС».**

СВАЯ СПРАВА

# ВІДАЦЬ БІЗНЕСМЕНА ПА ЎЛОВЕ

## На Магілёўшчыне вызначаны найлепшыя маладыя прадпрымальнікі

**Пачаць сямейную справу на пустынным яры рызыкнулі Артур і Таццяна ШАПЯЦЬКО з Чавусаў. І не памыліліся. Зрабілі сажалку і заняліся развядзеннем рыбы. Карп, амур, таўсталобік, карась, шчупак з іх фермерскай гаспадаркі сталі карыстацца вялікім попытам на рынку, а мясцовыя рыбакі абралі новы вадаём для ўлюбёнай справы.**

На хвалі поспеху сужэнцы пачалі працаваць без выхадных, шукаць новыя магчымасці для пашырэння справы. Але хутка зразумелі: аднаго жадання замала, патрэбныя яшчэ і спецыяльныя веды.

Іх і атрымалі на бясплатным навучанні ў чавускім цэнтры падтрымкі і развіцця прадпрымальніцтва, куды запрасілі бізнесменаў-пачаткоўцаў з саміх Чавусаў, Крычава, Краснаполля, Чэрыкава. Прафесійныя трэнеры з Магілёва і Мінска выклалі ўдзельнікам усе асновы вядзення справы.

стар. 16



## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Хочаце кватэру?



Пераязджайце ў Касцюковічы, што на Магілёўшчыне, — умовы там спрыяльныя. стар. 4

### Па слядах «Белых Рос»...



Як будзе будавацца Гродна ў найбліжэйшыя 10 гадоў. стар. 13

### «Квадраты» для мінчан



У Смалявічах ужо пабудавалі адзін «сталічны» дом. Што далей? стар. 14

### Дзе чакаць аўтакраму?



Праект мясцовай ініцыятывы рэалізавалі ў Кобрынскім раёне. стар. 15

### «Вуда» для беспрацоўных



У Гомелі правядуць найбуйнейшы з пачатку года кірмаш вакансій. стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Аб агульных Мэтах ды не толькі...

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна ШЧОТКІНА правяла сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Грузіі ў Рэспубліцы Беларусь Валерыем КВАРЦХЕЛІЯ.**

На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні гандлёва-эканамічнага, інвестыцыйнага і гуманітарнага супрацоўніцтва, паведамілі ў Савеце Рэспублікі.



sovrep.gov.by

Беларусь і Грузія маюць неабходны патэнцыял для павелічэння аб'ёмаў узаемнага гандлю, развіцця прамысловай кааперацыі, адзначыла Мар'яна Шчоткіна. Адзін з прыкладаў паспяховага супрацоўніцтва — зборачная вытворчасць ліфтаў, адкрытая ў Тбілісі. Сёлета ў Грузіі ёсць намер запусціць сумесную вытворчасць па зборцы малых трактароў.

Падчас перагавораў разглядаліся таксама перспектывы двухбаковага партнёрства ў сельскай гаспадарцы, фармацэўтычнай галіне, гуманітарнай сферы і турызме. Акрамя таго, абмяркоўваліся пытанні арганізацыі работы па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Асаблівую ўвагу бакі аддалі развіццю міжпарламенцкіх сувязяў і ролі парламенцкага вымярэння ва ўмацаванні беларуска-грузінскага супрацоўніцтва. Размова таксама ішла аб рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых падчас візіту віцэ-спікера верхняй палаты беларускага парламента ў Грузію ў снежні мінулага года, калі Мар'яна Шчоткіна брала ўдзел у цырымоніі інаўгурацыі Прэзідэнта Грузіі Саламэ Зурабішвілі. Нагадаем, што ў рамках леташняга візіту адбыліся рабочыя сустрэчы з прэм'ер-міністрам, спікерам парламента і міністрам замежных спраў Грузіі.

# Плён ад узаемадзеяння

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу па супрацоўніцтве з парламентам Вялікабрытаніі Алег РУМО правёў сустрэчу з членам камітэта Палаты лордаў парламента Вялікабрытаніі па справах Еўрапейскага саюза, падкамітэта па знешніх сувязях баранесай Элісан Мэры СУЦІ.**

Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, бакі абмеркавалі актуальныя пытанні далейшага супрацоўніцтва, асаблівую ўвагу аддалі ўзаемадзеянню ў медыцыне, адукацыі і навуцы.

Умацаванне парламенцкіх сувязяў спрыяе актывізацыі партнёрства паміж краінамі па розных напрамках — ад палітыкі, эканомікі да гуманітарных праектаў, адзначыў Алег Румо. Паводле яго слоў, у Беларусі і Вялікабрытаніі ёсць шмат сфер, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Летась Мінск наведала парламенцкая дэлегацыя Вялікабрытаніі, прайшлі перагаворы ў Савеце Рэспублікі, дзе абмяркоўваліся канкрэтныя сумесныя праекты. «Сённяшняя сустрэча — гэта працяг нашага плённага ўзаемадзеяння з калегамі», — падкрэсліў ён.

Алег Румо праінфармаваў аб дзейнасці Савета Рэспублікі, структуры беларускага парламента, спыніўся на пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва. У сваю чаргу Элісан Мэры Суці расказала аб сваім наведванні Белдзяржуніверсітэта і сустрэчы з беларускімі студэнтамі ў рамках візіту ў Мінск. У цэлым для дзвюх краін важна абменьвацца вопытам у розных сферах. Парламенцкае ўзаемадзеянне спрыяе гэтым працэсам, падкрэсліла яна.

# ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ У ЭФЕКТЫЎНЫМ ПАРТНЁРСТВЕ

**Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ абмеркаваў пытанні гандлёва-эканамічнага, інвестыцыйнага і гуманітарнага супрацоўніцтва з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Арменіі ў Рэспубліцы Беларусь Арменам ГЕВАНДЗЯНАМ.**

Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, падчас сустрэчы бакі аддалі асаблівую ўвагу пабудове ўзаемавыгаднага інтэграцыйнага ўзаемадзеяння ў рамках ЕАЭС.

Беларусь зацікаўлена ў больш эфектыўным партнёрстве з Арменіяй у інвестыцыйнай сферы, адзначыў Міхаіл Мясніковіч.



Фота БелТА.

— Нам трэба не проста гандляваць паміж сабой, а ствараць сумесныя кампаніі, каб бізнес нашых краін больш актыўна працаваў адзін з адным, — адзначыў старшыня Савета Рэспублікі. — Пакуль сумесных інвестпраектаў няшмат, а тыя, што ёсць, часцяком рэалізуюцца ў вельмі павольным рэжыме.

— Трэба рухацца больш канкрэтна, быць можа, — па шляху невялікіх праектаў, напрацоўваць гэты вопыт, — працягнуў ён.

Акрамя таго, на сустрэчы абмяркоўваліся пытанні паставак у Арменію тэхнікі МТЗ і БелАЗа, разглядаліся магчымасці сумеснай вытворчасці прадукцыі машынабудавання для далейшага выхаду на рынкі трэціх краін.

Не засталіся па-за ўвагай і пытанні ўзаемадзеяння ў галіне навукі і інавацый, медыцыны, адукацыі. Асобна закранулі тэму пашырэння маладзёжных кантактаў паміж краінамі, у тым ліку па лініі маладзёжнага парламентарызму.

Між іншым, развіццю міжпарламенцкіх сувязяў надаецца вялікае значэнне. Як заўважыў Армен Гевандзян, Арменія зацікаўлена ва ўмацаванні парламенцкіх кантактаў з нашай краінай. Гэта спрыяе прасоўванню міждзяржаўнага супрацоўніцтва.

— Важна, каб наша міжпарламенцкая камісія працягвала сваю працу, якая носіць планамерны, рэгулярны характар. Камісія заўсёды разглядае актуальныя для нас пытанні. Важнае таксама ўзаемадзеянне і ў рамках міжурадавай камісіі, — падкрэсліў дыпламат і выказаў гатоўнасць стаць сувязным звяном у арганізацыі гэтай працы.

У сваю чаргу Міхаіл Мясніковіч дадаў, што беларускі бок заўсёды адкрыты для абмеркавання любых пытанняў.

— Са свайго боку будзем аказваць усялякае садзейнічанне, каб ваша праца на пасадзе пасла была эфектыўнай, — рэзюмаваў ён.

# ДЗЕЛЯ ПАШЫРЭННЯ СУВЯЗЯЎ

## Сёлета павінен адбыцца першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана

**Падрыхтоўку да яго абмеркавалі падчас сустрэчы старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА з дэлегацыяй Ташкенцкай вобласці Рэспублікі Узбекістан, якую ўзначальваў хакім вобласці Гуламжон ІБРАГІМАЎ.**

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента, асаблівую ўвагу падчас сустрэчы бакі аддалі правядзенню першага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана, які пройдзе ў 2019 годзе. Савет Рэспублікі актыўна працуе над яго падрыхтоўкай, адзначыў Міхаіл Мясніковіч. Спікер верхняй палаты парламента прапанаваў абмеркаваць магчымасці ўмацавання рэгіянальнага супрацоўніцтва, пашырэння дагаворна-прававой базы паміж краінамі. Ён падкрэсліў, што ў апошнія два гады супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана прыкметна актывізавалася. Гэта абумоўлена рэалізацыяй дамоўленасцяў, дасягнутых падчас афіцыйнага візіту лідара нашай краіны Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан, што адбыўся летась у сярэдзіне верасня. Рэалізуецца план мерапрыемстваў па развіцці двухбаковага супрацоўніцтва. Ідзе праца над новымі сумеснымі праектамі ў лёгкай прамысловасці, машынабудаванні, абутковай прамысловасці, фармгаліне, сельскай гаспадарцы.

Асаблівую цікавасць Узбекістан праяўляе да беларускіх інавацый і навукова-тэхнічнай сферы, падкрэсліў **міністр інавацыйнага развіцця Узбекістана Ібрахім АБДУРАХМОНАЎ.** Паводле яго слоў, у цяперашні час вывучаецца магчымасць адкрыцця з двух навукова-даследчых лабараторый — на тэрыторыі Узбекістана і ў Беларусі. Абмяркоўваюцца канкрэтныя напрамкі ўзаемадзеяння паміж навуковымі супольнасцямі дзвюх краін, прапрацоўваюцца сумесныя праекты.

З улікам вялікай цікавасці да навукі і інавацый Міхаіл Мясніковіч прапанаваў сумесна правесці Форум навуковых ідэй. Гэта дапамагло б вучоным і бізнесу вызначыць сферы, якія ўяўляюць узаемную цікавасць, і эфектыўна пабудаваць сумесную працу.

У сваю чаргу кіраўнік дэлегацыі Гуламжон Ібрагімаў падкрэсліў, што ў дзвюх краін ёсць добрыя перспектывы развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва. Правядзенне першага Форуму рэгіёнаў будзе садзейнічаць умацаванню партнёрскіх сувязяў паміж рэгіёнамі і гарадамі. Дамоўленасці, дасягнутыя кіраўнікамі дзяржаў, садзейнічаюць паспяховаму ўмацаванню двухбаковага партнёрства, адзначыў ён.

# Культурнае, гуманітарнае і адукацыйнае супрацоўніцтва

## Што яшчэ абмяркуюць на палях чарговага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі?

**На мінулым тыдні ў Санкт-Пецярбургу прайшло першае сумеснае пасяджэнне беларускага і расійскага арганізацыйных камітэтаў па падрыхтоўцы і правядзенні VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.**

Як інфармуе афіцыйны сайт верхняй палаты беларускага парламента, удзел у пасяджэнні бралі намеснік старшыні Савета Рэспублікі, старшыня аргкамітэта з беларускага боку Мар'яна Шчоткіна, члены Прэзідыума Савета Рэспублікі Віктар Сірэнка, Аляксандр Папкоў і Уладзімір Панцюхоў.



Фота Савета Федэрацыі.

Сёлета форум будзе прысвечаны культурнаму, гуманітарнаму і адукацыйнаму супрацоўніцтву паміж краінамі. Тэмай пленарнага пасяджэння стануць міжрэгіянальныя сувязі як аснова фарміравання адзінай культурнай і гуманітарнай прасторы народаў Беларусі і Расіі.

Як адзначыла Мар'яна Шчоткіна, важнай часткай праграмы стане круглы стол «Стратэгія развіцця Саюзнай дзяржавы».

— Усе тыя пытанні, якія сёння хвалююць нашы народы і што знаходзяцца ў працы нашых урадаў і парламентаў, — будуць абмяркоўвацца на палях форуму, — падкрэсліла віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента. На яе думку, дэвізам чарговага форуму можа стаць «Развіццё рэгіянальнага супрацоўніцтва як эфектыўны інструмент фарміравання адзінай культурнай і гуманітарнай прасторы».

На форуме будуць падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі дзвюх краін, камерцыйныя кантракты, іншыя дакументы аб партнёрстве.

— Ужо ёсць тэмы для абмеркавання, якія прапануюць прадпрымальнікі. Ёсць шмат прапаноў. Саветы дзелавога супрацоўніцтва ставяць перад сабой задачу абмеркаваць праблемныя пытанні і знайсці рашэнні, — праінфармавала Мар'яна Шчоткіна.

У сваю чаргу віцэ-спікер Савета Федэрацыі Юрый Враб'ёў расказаў, што ў мерапрыемствах VI Форуму рэгіёнаў прымуць удзел усе рэгіёны Беларусі і больш за 70 рэгіёнаў Расіі. Усяго — больш за 600 удзельнікаў.

# БОЛЬШ АРЭНДНАГА ЖЫЛЛЯ...



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

## Браць прыклад з Мінска

Як гаварылася падчас нядаўняй сустрэчы **Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі з мэрам Мінска Анатолем Сіваком,** аб'ёмы будаўніцтва жылля ў сталіцы будуць штогод скарачацца, пры гэтым мяркуецца актыўна развіваць гарады-спадарожнікі.

Усяго ў сталіцы на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў стаіць больш за 198 тысяч чалавек — трэцяя частка ад агульнарэспубліканскай колькасці. З іх 5797 — шматдзетныя сем'і, якія маюць першачарговае права для накіравання на будаўніцтва.

Як расказала **намеснік старшыні камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Ірына ГОНТАРАВА,** працягнецца развіццё арэнднага жылля, прапануюцца новыя падыходы да фарміравання кошту будаўніцтва жылля, прапрацоўваюцца больш гнуткія рашэнні ў дачыненні да прыватнага сектара.

Намеснік старшыні камітэта паведаміла, што праблему жылля для льготнікаў трэба вырашыць за два гады. Дарэчы, жыллё з дзяржаўнай падтрымкай у Мінску сёлета будзе будавацца толькі для льготных катэгорый грамадзян, у асноўным для шматдзетных сем'яў.

Варта падкрэсліць, што да 2016 года ў галоўным мегаполісе краіны ўводзілася каля 1 мільёна квадратных метраў жылля штогод. Будаўніцтва вялося як на свабодных пляцоўках, так і на тэрыторыях, якія не рэканструююцца. Цяпер свабодных участкаў практычна не засталося, патрабуецца знос прыватнага сектара, прамысловых аб'ектаў. Аб'ёмы ўводу жылля скараціліся. Калі летась было пабудавана 718 тысяч «квадратаў», то план на гэты год — 670 тысяч квадратных метраў жылля.

Сёлета ўключыць у план будаўніцтва плануецца каля 1900 шматдзетных сем'яў.

## Будуецца 15 дзіцячых садкоў, а не хапае 20

Што датычыцца Мінска, сёлета спецыялісты-забудоўшчыкі плануюць раскрыць новыя пляцоўкі ў Чыжоўцы і Лошыцы. Працягнецца забудова ў межах вуліц Шаранговіча — Гарэцкага — Рафіева. Узводзяць жыллё і прыватныя інвестары. Па інвестыцыйнай праграме на будаўніцтва інжынерна-транспартнай інфраструктуры выдзяляецца каля 170 мільёнаў рублёў. Запланаваны фінансавыя сродкі і на будаўніцтва 15 дзіцячых садкоў. «Такога ніколі не было. Заўсёды ўзводзілася не больш за пяць—сем аб'ектаў для дзяцей, але мікрараёны будуюцца і маюць патрэбу ў сацыяльнай інфраструктуры», — дадала Ірына Гонтарава.

Сталіцы нашай краіны выдзелена 850 мільёнаў рублёў на капітальнае будаўніцтва і для падрыхтоўкі мегаполіса да правядзення II Еўрапейскіх гульняў. У той жа час зразумела, што і жыхароў трэба забяспечыць сацыяльнай інфраструктурай. У сталіцы сёння не хапае 20 дзіцячых садкоў і сямі школ. Гарвыканкам дэталёва даследаваў гэтае пытанне. І высветлілася, што месцы мінчан у дзіцячых садках часта займаюць дзеці жыхароў Мінскай вобласці, якія працуюць у сталіцы. Часцей за ўсё гэтая праблема актуальная для садкоў каля МКАД.

## «Квадраты» для ўсіх і сваіх

Цяпер ужо штогод у сталіцы ўводзяцца ў эксплуатацыю адзін-два дамы з жылымі памяшканнямі камерцыйнага выкарыстання. Сёлета пабудаваны адзін такі жылы дом на раёне вуліцы Выгоцкага плошчай каля пяці тысяч квадратных метраў. Яшчэ адзін падобны аб'ект з жылой плошчай 19 тысяч «квадратаў» будуецца ў межах вуліц Кірэенкі — Адоеўскага, дзе заказчыкам выступае завод эфектыўных прамысловых канструкцый. Летась пабудавана 8,7 тысячы «квадратаў» арэнднага жылля.

У мэрыі цяпер прапрацоўваецца пытанне ўвядзення арэнднага дома для работнікаў бударганізацый. Дом у Мінску будзе ўзводзіцца не за сродкі горада, а сіламі будаўнічых арганізацый непасрэдна для супрацоўнікаў будаўнічага комплексу.

Дарэчы, даволі радыкальны бонус для работнікаў вынес на абмеркаванне **член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль ГРЫШУК,** які да нядаўняга часу ўзначальваў Гродзенскі мясакамбінат.

Ён прапанаваў даць магчымасць прадпрыемствам пагашаць працэнты за жыллёвы крэдыт сваіх работнікаў. Што і казаць, меры даволі смелыя і не кожнае прадпрыемства можа сабе гэта дазволіць. Таму ініцыятыва будзе разглядацца пазней і прынята як рэкамендацыя. Разам з тым Анатоль Грышук упэўнены, што такая мера — адна з самых дзейсных на замацаванні работнікаў на вытворчасці.

На сесіі гарадскога Савета ў Гродне прагучаў зварот да дэпутатаў-кіраўнікоў аб удзеле на прынцыпах кааперацыі ў будаўніцтве арэндных кватэр. Увогуле, было вырашана, што будаўніцтва жылля будзе актывізавана. У першую чаргу кватэры атрымаюць шматдзетныя і тыя, хто мае патрэбу, а такіх у горадзе больш за 1200 чалавек.

## Эксперымент са спадарожнікамі

Распрацаваны праект указа, паводле якога запланавана будаўніцтва эксперыментальнага жылога дома для мінчан у Смалявічах.

Праект указа прадугледжвае аказанне грамадзянам, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў на тэрыторыі Мінска, дзяржаўнай падтрымкі для будаўніцтва ў гэтым доме ў рамках Указа № 240 (ён прадугледжвае дзяржаўныя субсідыі на пагашэнне крэдыту на жыллё). Але галоўная навізна ў тым, што падаваць заяву на будаўніцтва ў эксперыментальным доме змогуць нават тыя, хто стаў на чаргу зусім нядаўна. Аб пачатку падачы заявак загадзя апавясцяць праз СМІ і адміністрацыі раёнаў. Калі ахвотных будавацца ў Смалявічах набярэцца больш, чым кватэр у доме, тады перавага будзе аддавацца тым, хто стаў на чаргу раней.

Хутчэй за ўсё, гэта будзе звычайны дом тыпавых спажывецкіх якасцяў. Мяркуецца, што будзе ён у канструкцыях МАПІДа. Улады інфармуюць аб тым, што цана квадратнага метра там будзе ніжэй, чым у Мінску. Калі гэты эксперымент актыўна падтрымаюць жыхары сталіцы, тады па такім прынцыпе сітуацыя будзе развівацца і далей.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Больш падрабязна аб горадабудаўнічых планах гэтага спадарожніка ў матэрыяле «Да Мінска — рукой падаць» (стар. 14).**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)*

БУДЗЬ У КУРСЕ!

# Што патрэбна, каб знізіць цэны на кватэры?

**У мінулым месяцы ўступіў у сілу новы ўказ Прэзідэнта аб долевым будаўніцтве. У Міністэрстве будаўніцтва і архітэктуры пракаментавалі, што зменіцца дзякуючы гэтаму дакументу.**

Летась у снежні быў падпісаны Указ № 473 аб долевым будаўніцтве. А 13 сакавіка гэтага года ўступіла ў сілу пастанова ўрада № 156, якой зацверджана Палажэнне аб парадку заключэння, выканання і скасавання дагавораў стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва. Мы даведаліся, што новага ўтрымліваюць гэтыя нарматыўна-прававыя акты.

## Карупцыі тут не месца

У практыцы ёсць нямала выпадкаў, калі забудоўшчыкі (долевае будаўніцтва) для актывізацыі продажу кватэр і прыцягнення да іх спажыўцоў, зніжаюць цэны на кватэры. Па раней дзеючым заканадаўстве такое рашэнне афармлялася загадам кампаніі. Праваахоўныя органы ўбачылі ў такой схеме рэалізацыі кватэр карупцыйны складнік. Таму ў новым указе прапісаная норма, згодна з якой непрададзеныя кватэры знаходзяцца ў забудоўшчыка не больш за месяц. Калі заказчык хоча знізіць на іх цану, ён павінен апублікаваць па гэтых кватэрах праектную дэкларацыю з указаннем новай цаны.

## Набываць жыллё будзем толькі за рублі

Да цяперашняга часу дзейнічала норма, згодна з якой кошт кватэр у дагаворах долевага будаўніцтва прапісваўся ў беларускіх рублях з прывязкай да долара. Новым указам такая магчымасць выключана. Праўда, гэтая норма распаўсюджваецца толькі на дамы, дакументацыя па якіх атрымана пасля ўступлення ў сілу новага ўказа.

Сапраўды, у нашай краіне ўзяты курс на дэдаларызацыю. У гэтай сувязі было прынята рашэнне, што разлікі за жыллё мэтазгодна рабіць у беларускіх рублях без прывязкі да замежнай валюты. Міністэрствам эканомікі распрацаваны прагнозныя індэксы цэн у будаўніцтве, якія разлічваюцца на некалькі гадоў. Калі да моманту здачы дома ў эксплуатацыю яны павялічацца ў параўнанні з тымі, якія ўлічваліся пры першапачатковым разліку кошту, то забудоўшчык мае права аўтаматычна павысіць кошт жылля. Да таго ж у апошнія гады ў нашай краіне не назіраецца рэзкіх скачкоў курсу рубля ў адносінах да долара, ён застаецца адносна стабільным.

## Каб будоўля не стала даўгабудам

Згодна з ранейшым заканадаўствам, калі забудоўшчык не ўкладваўся ў нарматыўныя тэрміны ўводу дома ў эксплуатацыю, ён павінен быў папярэдзіць пра гэта дольшчыкаў за два месяцы. У новым указе гэты тэрмін скарочаны да аднаго месяца. Зараз падрыхтаваны новы праект пастановы ўрада аб правілах заключэння дагавораў падраду, у якім прапануецца працягваць нарматыўны тэрмін будаўніцтва толькі адзін раз.

З іншага боку, часам у будаўніцтве ёсць шмат дольшчыкаў, якія не разлічваюцца па рахунках месяцамі. Значыць, з імі трэба скасоўваць дагаворы і заключаць іх з іншымі дольшчыкамі. У міністэрстве лічаць, што нельга бясконца падаўжаць нарматыўны тэрмін будаўніцтва, бо гэта выліваецца ў вялікую трагедыю для дольшчыкаў, асабліва тых, хто плаціць своечасова.

## Абмен без грошай

Па дзеючым раней заканадаўстве, дольшчык у працэсе будаўніцтва меў права памяняць адну кватэру ў доме на іншую. Але пры гэтым ён павінен быў скасаваць першы дагавор, атрымаць унесеныя на будаўніцтва кватэры грошы з індэксацыяй, а затым заключыць другі дагавор і ўнесці грошы на будаўніцтва новай кватэры. Сума індэксацыі заставалася на руках у дольшчыка.

Пагадзіцеся, гэта не зусім лагічна. Таму распрацоўшчыкамі ўказа было прынята рашэнне, што ў такіх выпадках з дольшчыкам будзе заключацца дадатковае пагадненне да існуючага дагавора з указаннем нумара новай кватэры. А грошы, якія накіроўваліся на будаўніцтва першага жылога памяшкання, будуць залічвацца і пры будаўніцтве іншай кватэры без індэксацыі.

І яшчэ, на практыцы ўзнікалі выпадкі, калі пасля заканчэння будаўніцтва дома цана на кватэры ў ім зніжалася. Часцей за ўсё гэта датычылася жылля людзей, якія будавалі сабе кватэры з дзяржаўнай падтрымкай. Раней пераплачаныя грашовыя сродкі вярталіся толькі Беларусбанку на пагашэнне льготнага крэдыту. Цяпер яны будуць акумулявацца і на іншых крыніцах фінансавання (субсідыі, камерцыйны крэдыт, уласныя сродкі), у тым ліку на разліковых рахунках саміх дольшчыкаў.

## Ключы толькі пасля дзяржрэгістрацыі

Новым указам прадугледжана, што кватэры будуць перадавацца дольшчыкам толькі пасля таго, калі яны зарэгіструюць свае правы ўласнасці на жыллі.

Эксперты Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры нагадваюць, што да ўступлення ў сілу новага дакумента дольшчык мог атрымаць дакументы на жылое памяшканне і ключы, а потым доўгі час не рэгістраваць свае правы на яго. А ў выніку забудоўшчык быў вымушаны несці выдаткі па аплаце камунальных плацяжоў за кватэру. Часта гэта былі не адзінкавыя жылыя памяшканні ў доме, а аплата «камуналкі» за іх асабліва моцна біла па кішэні заказчыкаў зімой у ацяпляльны перыяд і пагаршала іх фінансавае становішча. Цяпер гэтага не будзе.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ХОЧАЦЕ КВАТЭРУ? ПЕРАЯЗДЖАЙЦЕ Ў КАСЦЮКОВІЧЫ

## Такую альтэрнатыву прапануюць на перыферыі тым, хто не мае свайго жылля ў вялікім горадзе



Ну чым не гарадскі пейзаж?

**Малая радзіма вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў Аркадзя Куляшова, Івана Чыгрынава, Аляксея Русецкага, Алеся Пісьмянкова заўсёды славілася не толькі сваімі талентамі, але і маляўнічымі мясцінамі. І калі б не Чарнобыль, які, на жаль, закрануў гэты прыгожы край, жыццё тут яшчэ больш віравала б. Але апошнім часам раён зноў пачаў імкліва развівацца. Асабліва гэта бачна па Касцюковічах. Тут з'явіліся вялікі ФАК з басейнам, некалькі буйных гандлёвых цэнтраў, сацыяльныя аб'екты. А галоўнае — поўным ходам ідзе будаўніцтва жылля. І маладыя матулі з каляскамі на вуліцах горада сёння зусім не рэдкасць.**

### І жыллё, і інфраструктура

Будаўніцтва ў Касцюковічах не прыпыняецца. І **начальнік адзела архітэктуры і будаўніцтва райвыканкама Уладзімір СУСЬКО** на правах галоўнага архітэктара горада запрашае перакanацца ў гэтым. 40-кватэрны дом на вуліцы Максіма Горкага, дзе мы робім першы прыпынак, здадзены летась у снежні, частка яго жыхароў — сем'і, якія будаваліся па 240-м Указе. Другая палова дома аддадзена пад арэнднае жыллё. Від збоку крыху псуе цеплатраса, трубы якой акаляюць дзіцячую пляцоўку. Але, як запэўнівае спецыяліст, гэта з'ява часовая. Вунь, махае ён рукой убок, новая кацельная будуецца. Старая знаходзіцца за горадам, на тэрыторыі цэментнага завода, гэта пяць кіламетраў ад райцэнтра. З уводам новай паменшацца страты па дастаўцы энерганосьбітаў, а значыць і сумы ў жыроўках грамадзян. Здача аб'екта запланавана ўжо ў сёлета.

— Горад імкліва расце, развіваецца і інфраструктура — усё ўзаемазвязана, — адзначае галоўны архітэктар. — План па будаўніцтве жылля летась перавыканалі на 107 %, а калі ўлічваць і індывідуальнае жыллё, то на ўсе 140. Па горадзе здадзена 2200 квадратных метраў жылля, а індывідуальнага 2070 — пры заданні 1800.

### Як грыбы пасля дажджу

Новы мікрараён знаходзіцца ў маляўнічай мясціне, побач з возерам Баравец і яго ўтульнымі месцамі адпачынку. Непадалёк узводзіцца яшчэ адзін 40-кватэрны дом, які мы едзем глядзець. Здача ў чэрвені. На будаўнічай пляцоўцы аж дым курыць. Шчыруюць работнікі ПМК № 260.

— Апошнія трынаццаць гадоў не сядзім без работы — працуем і зімой, і летам, — усміхаецца майстар Андрэй Матыка. — Моладзі шмат, нехта праходзіць практыку. Амаль усе мясцовыя.

Аляксандр Пільнікаў з Бялынкавіч асвойвае ў магілёўскім ліцэі прафесію зваршчыка. Зараз праходзіць практыку ў ПМК. Прызнаецца, што ўмовы працы яму падабаюцца. І ў будучым не супраць звязаць свой лёс з Касцюковічамі.

Галоўны забудоўшчык горада — ПМК № 260 — наогул аўтарытэтная арганізацыя. Уладзімір Сусько прапануе з'ездзіць на вуліцу Камсамольскую і паглядзець, як узорна яна рыхтуецца да ўзвядзення чарговага жылога дома. Адметнасць у тым, што фінансаванне яшчэ пакуль не пачалося, а ПМК за свае абаротныя сродкі ўжо падрыхтавала катлаван і падвезла будматэрыялы. «Вось як трэба працаваць, — заўважае мой гід. — Дом яшчэ налета будзе здавацца, а забудоўшчык ужо паклапаціўся правесці падрыхтоўчыя работы. Пакуль сухое надвор'е, можна зрабіць якасны фундамент, каб потым дом не «гуляў».

### Касцюковіцкая Рублёўка

Дарэчы, мікрараён, дзе ўзводзіцца дом, маладзёжны. Яго ў народзе ахрысцілі АБВГДэйка. Тут дамоў пад нумарам адзін — паўалфавіта. З аднаго з іх выходзіць маладая сям'я з каляскай. Як высветлілася, Ганна і Дзмітрый справілі наваселле тут пяць гадоў таму, а ў чарзе на кватэру сталі ўсяго год. Мужчына працуе ў ПМК, а жонка ў калгасе «Парыжская Камуна». Цяпер яна ў дэкрэтным адпачынку. Сужэнцы прызнаюцца: ім падабаецца жыць у малым горадзе. І крамы пад бокам, і некалькі рынкаў у горадзе, і фізкультурны цэнтр з басейнам, а галоўнае — прырода, свежае паветра, птушкі пяюць, з гэтым у мегаполісе дэфіцыт.



Ганна і Дзмітрый: «А нам падабаецца ў Касцюковічах».

Яшчэ лепш, калі ў цябе свой дом. Тых, хто аддае перавагу індывідуальнаму будаўніцтву, у горадзе таксама хапае. Каб не быць галаслоўным Уладзімір Сусько вязе на вуліцу Краснапольскую, якую жартам называе мясцовай Рублёўкай. Уздоўж дарогі тут стаяць прыгожыя катэджы. Насупраць лес, за ім рэчка. Сапраўды Рублёўка.

### Бум на арэнднае жыллё

Сёння ў Касцюковічах афіцыйна зарэгістравана каля 16 тысяч чалавек. І гэта лічба не памяншаецца. Аграгарадкі таксама развіваюцца. У ліку перспектыўных — Белая Дуброва, вядомая сваім гусіным фестывалем. Тут шмат было пабудавана жылля да 2009 года, і народ зараз актыўна яго прыватызуе. У аграгарадках Муравілле і Новыя Саматэвічы наогул няма пустуючага жылля.

— Сёння ў Касцюковічах у чарзе на жыллё стаіць 523 сям'і, з іх 64 — шматдзетныя, — удакладняе **статыстыку па гараджанах начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Касцюковіцкага райвыканкама Мікалай ПАТАПЕНКА.** — Апошнія мы маглі б забяспечыць квадратнымі метрамі хоць сёлета, але некаторыя адмаўляюцца і працягваюць стаяць на чарзе. Астатнія таксама доўга не чакаюць. За апошнія гады чарга паменшылася амаль на чвэрць. Па сутнасці, мы б маглі будаваць і болей, былі б ахвотныя. Вельмі прывабныя ўмовы будаўніцтва па Указе № 235: крэдыт выдаецца пад 1 %, але чалавек павінен адпрацаваць не менш як 10 гадоў у раёне. І такія людзі ёсць. Касцюковічы — горад, які развіваецца. Тут працуе адно з найбуйнейшых у краіне прадпрыемстваў — Беларускі цэментны завод. Ёсць цэлы мікрараён, дзе жывуць сем'і яго работнікаў.

Вялікі попыт у раёне на арэнднае жыллё, або, як афіцыйна яно называецца, — жыллё камерцыйнага выкарыстання.

— Такія кватэры ў нас асабліва запатрабаваныя, — удакладняе Мікалай Патапенка. — На сёння плата за яго бярэцца з улікам паніжальнага каэфіцыента — 1,53 рубля за квадратны метр. Атрымліваецца нават танней, чым плаціць за кватэру, пабудаваную з улікам крэдыту. Не кажучы ўжо пра жыллё па найме, якое прапануюць гараджане. На арэндныя кватэры ў нас спачатку быў попыт па пяць—шэсць ахвотных на адну. І зараз як толькі нешта вызваляецца, адразу ж знаходзіцца чарговы арандатар. Мы пастаянна інфармуем жыхароў праз наш сайт і сродкі масавай інфармацыі. На вёсцы каэфіцыент на арэнднае жыллё яшчэ ніжэйшы. У некаторых населеных пунктах і чаргі нават няма. Любы можа прыехаць і жыць. Нават з Магілёва.

### З перспектывай на будучае

— Штогод у нас уводзіцца не менш чым тры тысячы квадратных метраў жылля ў раёне, — кажа **намеснік старшыні Касцюковіцкага райвыканкама Вячаслаў МАКСАЧОЎ**, які курыруе пытанні будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі. — На сённяшні дзень ужо распрацавана горадабудаўнічая дакументацыя на пляцоўку пад будаўніцтва чатырох дамоў. На перспектыву, у адпаведнасці з генпланам, у нас падабраныя яшчэ дзве пляцоўкі, дзе будзе весціся забудова як шматкватэрнага жылля, так і індывідуальнага. Наогул па будаўніцтве жылля ад людзей у нас пытанняў не ўзнікае. Ад моманту пастаноўкі на чаргу і да моманту ўключэння ў спіс на будаўніцтва канкрэтнага дома праходзіць у сярэднім тры—чатыры гады. Шматдзетныя сем'і наогул атрымліваюць такую прапанову на працягу года.

**Уладзімір ПЕТРУСЕВІЧ, старшыня Касцюковіцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— Я ведаю некалькі прыкладаў, калі маладыя людзі, у тым ліку з Магілёва, заставаліся ў Касцюковіцкім раёне і дагэтуль тут працуюць. Вырашальную ролю ў гэтым адыграла жыллё. Людзі бяруць крэдыты і будуюць. І гэта добры знак таго, што яны пажадалі застацца. Для моладзі самае галоўнае — дзе жыць. Перспектыўны аграгарадок Новыя Саматэвічы. Там жыве шмат людзей, якія працуюць на Беларускім цэментным заводзе. Наогул, заўсёды агітую моладзь заставацца ў раёне, бо ў нас вельмі добрыя перспектывы хутка атрымаць жыллё. Вось зараз на час пасяўной за мной замацаваная гаспадарка «Машавое-агра», а там тры стажоры працуюць, якія вучацца ў Клімавіцкім аграрным каледжы. Гаспадарка забяспечвае спецыялістаў жыллём, і я між іншым пра гэта хлопцам нагадваю. У нас менш гарадской мітусні, прыгожая прырода, шчырыя людзі — што яшчэ трэба?

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Мазыр і Петрыкаў папрыгажэюць

**На працягу апошніх гадоў на Гомельшчыне склалася практыка, калі штогод комплексна прыводзяцца ў парадак два гарады. Новае аблічча ўжо набылі 12 райцэнтраў. У 2019 годзе памаладзеюць палескія Петрыкаў і Мазыр. У Мазыры комплекснае добраўпарадкаванне будзе ісці на працягу двух гадоў. У планах на гэты год драмтэатр, басейн, іншыя спартыўныя аб'екты, праектуецца набярэжная. Спецыяльная ўвага аддаецца дваровым тэрыторыям.**

Летась у Гомельскай вобласці было ўведзена ў эксплуатацыю 486 арэндных жылых памяшканняў, агульнай плошчай 25,8 тысячы квадратных метраў, ці 136,9 % ад гадавога задання. Сёлета запланавана на 28,3 тысячы «квадратаў» жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду. У тым ліку плануецца да ўводу 15 такіх жылых дамоў. У Гомелі гэта 80 кватэр у мікрараёне № 59. Будуць пабудаваны аналагічныя дамы з рознай колькасцю кватэр у гарадскіх пасёлках Брагін, Камарын, Акцябрскі, Карма, Парычы, Бальшавік, у гарадах Рагачоў, Ельск, Мазыр, Лельчыцы, Жыткавічы, Калінкавічы, Петрыкаў...

Аддзяленне ААТ «ААБ Беларусбанк» адновіць работу ў адным з мікрараёнаў Мазыра. Справа ў тым, што раней па вуліцы Пралетарскай райцэнтра працавала аддзяленне, якое абслугоўвала каля шасці тысяч чалавек. Але ж банк прадаў будынак. Мясцовыя жыхары агучылі сваю просьбу аб аднаўленні дзейнасці аддзялення напярэдадні «Вялікай размовы з Прэзідэнтам». Вырашэнне пытання знойдзена: банку перададзена частка будынка ў арэнду. Цяпер на аб'екце вядуцца будаўнічыя работы. Плануецца, што яны завершацца да 1 ліпеня. У новым аддзяленні ўсталююць дадатковыя электронныя сродкі для правядзення розных аперацый.

Аўтадарога Гомель—Калінкавічы будзе пашырацца да чатырох палос руху. Гэты ўчастак з'яўляецца часткай трасы М10. Работы па аб'екце плануецца распачаць у 2020 годзе. Рэканструкцыя і ўтрыманне дарогі з Гомеля да Калінкавіч разглядаецца як рэалізацыя пілотнага праекта дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Таксама ў планах на наступныя гады — будаўніцтва аб'язной дарогі, якая дазволіць разгрузіць Калінкавічы ад транзітных патокаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Тэлесеткі

# МЫ — КАМАНДА!

**Шэсць камандаў па чатыры ўдзельнікі ў кожнай — журналісты, бізнесмены, артысты, прадстаўнікі Дырэкцыі II Еўрапейскіх гульняў, грамадскія дзеячы, тэлегледачы — трапілі ў праект АНТ «Спорт-фактар», здымкі якога пачаліся днямі. У спіс тэлевізійных спаборніцтваў увайшлі некалькі дысцыплін, якія мы гэтым летам убачым у праграме міжнароднага спартыўнага форуму: бег (эстафета 4х100 метраў), стэндавая стральба, веславанне, велагонка.**

Сярод тых, хто выпрабуе сам і прадэманструе гледачам спартыўныя здольнасці, сілу, вынослівасць і камандны дух, — вядучая спартыўных навін АНТ Любоў Леановіч і міжнародны аглядальнік Тэнгіз Думбадзэ, папулярны рокер Іван Бабішэвіч, спявачка і пасол добрай волі ААН Іскуі Абалян, дырэктар школы 3-пад Стоўбцаў Станіслаў Войніч, другая віцэ-міс Беларусь — 2018» Настасся Лаўрынчук, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, алімпійскі чэмпіён у веславанні на каноэ Аляксандр Багдановіч, шматдзетная маці, юрысконсульт Наталля Сіневіч, валанцёр II Еўрапейскіх гульняў Настасся Зенчанка, намеснік дырэктара Мінскага гадзіннікавага завода Дзяніс Рабушкін, судмедэксперт-біёлаг Дзяржкамітэта судовых экспертыз Вольга Кісялёва і іншыя.

Сёлета будуць здавацца два дамы на 19 паверхаў у мікрараёне Дзевятоўка. А ў Альшанцы пачне засяляцца маналітны вышынны дом, у якім на першым паверсе размесціцца дзіцячая амбулаторыя. Усяго ў горадзе зараз 7 дамоў на 19 паверхаў.

❍ У тэму

**Сёлета ў абласным цэнтры трэба ўвесці 180 тысяч «квадратаў» жылля. І гэта больш, чым летась. Значная частка прыпадае на індывідуальных забудоўшчыкаў. Такая тэндэнцыя мае падставы захавацца і далей.**

### На ўскрайку, але па санітарных нормах

У хуткім часе першыя навасёлы пачнуць абжываць новы мікрараён Грандзічы. Гэта паўночнае крыло горада, яго ўскраек. З пашырэннем межаў вёска Грандзічы ўлілася ў горад і дала назву новаму жылому раёну. Першы камень быў закладзены ў верасні мінулага года. Дарэчы, курс на поўнач — новая канцэпцыя забудовы горада. Зараз тут разгорнута самая маштабная будоўля.

У новым мікрараёне плошчай 80 гектараў будуць пражываць 65 тысяч гродзенцаў. Тут вызначаць 22 кварталы, з іх 8 — гэта індывідуальная жылая забудова. На першым этапе пабудуюць два мікрараёны, дзе палепшаць свае жыллёвыя ўмовы 11 тысяч гараджан.

Першыя два дамы на 150 кватэр будуць здадзены ўжо вясной. А да канца года будзе ўведзена дзевяць жылых дамоў. У праект закладзена будаўніцтва дзіцячага садка.

Пры будаўніцтве мікрараёна ў першую чаргу была звернута ўвага на санітарна-ахоўную зону. Справа ў тым, што за тры кіламетры знаходзіцца вытворчы філіял прадпрыемства «Краснасельскбудматэрыялы». А базавая санітарна-ахоўная зона для гэтага прадпрыемства складае 500 метраў.

Як паведамілі ў гарвыканкаме, яшчэ ў 2015 годзе згодна з патрабаваннямі заканадаўства ў галіне забеспячэння санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва для прадпрыемства быў распрацаваны праект санітарна-ахоўнай зоны з разлікамі рассейвання выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферным паветры, узроўняў фізічнага ўздзеяння і ацэнкай рызыкі для жыцця і здароўя людзей. Пастаянна вядзецца аналітычны кантроль. Больш таго, вытворчасць вапны перанесена з Гродна ў Краснасельск.

### Шчыльна і рацыянальна

Жылыя новабудоўлі настойліва «ўціскваюцца» ў гарадское асяроддзе. І для гэтага ёсць нямала рэзерваў. Можна выкарыстаць пустыя тэрыторыі ці знесці старыя пабудовы. Распрацаваны генплан, які прапануе нямала новых жылых ансамбляў.

Адзін з такіх комплексаў узводзіцца на месцы вытворчых пляцовак і вайсковых часцей, якія падлягаюць вынасу за межы гарадскіх тэрыторый. Участак пад забудову плошчай 90 тысяч «квадратаў» знаходзіцца ў раёне вуліц Татарская і Камбайнёрская. Жыхароў гэтых вуліц адсялілі ў выніку даволі сур'ёзнага падтаплення пры прарыве цеплясетак. Зараз тут рыхтуецца пляцоўка пад новабудоўлю. Шматпавярховікі вырастуць і на месцы былой ваеннай часці, што знаходзілася на вуліцы Пралетарскай — Шчорса.

Пачалася забудова былога ваеннага гарадка па вуліцы Лідскай. Тут будзе ўведзена 115 тысяч «квадратаў» жылля ў чатырох шматпавярховіках. Амаль столькі ж складзе плошча вышынных дамоў у мікрараёне Вясновы. Тэрыторыя знаходзіцца на ўзбярэжжы ракі Нёман. Гэта будзе элітны мікрараён. Такім бачаць яго сталічныя архітэктары, якія прапануюць свой праект з дамамі экстра-класа са шкла, метала і бетону. Для гэтага пад знос падпадае каля 50 дамоў прыватнай забудовы. У найбліжэйшай перспектыве трэба знесці яшчэ каля 100 дамоў у розных частках горада пад новабудоўлі.


На месцы «кіношнай» вёскі будзе новы мікрараён.

### У першую чаргу забяспечыць шматдзетных

Для гэтай катэгорыі кватэры пабудуюць у новых мікрараёнах Грандзічы і Альшанка. У мінулым годзе было здадзена 460 кватэр, сёлета будзе яшчэ 309.

У чарзе на жыллё ў гарвыканкаме стаіць 1308 шматдзетных сем'яў. Як расказалі ў гарадскім упраўленні капітальнага будаўніцтва, у 2020 годзе ўсе шматдзетныя сем'і, якія зараз стаяць на чарзе, будуць забяспечаны жыллём. Многія актыўна карыстаюцца магчымасцю пабудаваць уласны дом у раёнах індывідуальнай жылой забудовы, дзе ўчасткі для іх выдзяляюцца ў першую чаргу.

### Дзе тая вуліца?

Паралельна з будаўніцтвам вуліцы атрымліваюць і свае назвы. Прыкметна, што многія з іх называюцца ў гонар знакамітых гродзенцаў, якія прынеслі славу гораду. У мікрараёне Грандзічы з'явілася вуліца Аляксандра Курловіча ў памяць аб двойчы чэмпіёне Алімпійскіх гульняў па цяжкай атлетыцы, ганаровым грамадзяніне Гродна. У будучыні гэта вуліца стане праспектам.

У гэтым жа мікрараёне ўвекавечана імя вядомага гродзенскага гісторыка-краяведа Віктара Саяпіна. Прафесійны мытнік захапіўся гісторыяй свайго горада і выпусціў каля дзясятка цікавых і пазнавальных кніг з успамінамі аб мінулым горада, аб тым, што ўдалося, а што не ўдалося захаваць.

У гонар яшчэ аднаго гродзенца, заслужанага будаўніка Рэспублікі Беларусь Віктара Глухава, названа вуліца новага мікрараёна. Віктар Глухаў некалькі дзесяцігоддзяў узначальваў буйное будаўнічае прадпрыемства «Гроднажылбуд». Большасць жылля ў горадзе пабудавана менавіта гэтым прадпрыемствам.

Новая вуліца на месцы былога ваеннага гарадка атрымала назву Воінаў-інтэрнацыяналістаў. Дэпутаты гарсавета на мінулай сесіі прынялі пад увагу ініцыятыву Гродзенскай гарадской арганізацыі Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане, якія выступілі з адпаведнай прапановай. Яшчэ адна вуліца таго ж мікрараёна атрымала назву Прынёманская.

### Дамы каля калодзежа

Калодзеж гэты не просты, а знакаміты. Менавіта каля яго разыгралася драматычная сцэна ў фільме «Белыя росы», калі стары Фядос Ходас (Усевалад Санаеў) махаў сякерай на Мішку Кіселя (Станіслаў Садальскі). Калодзеж — гэта адзінае, што засталося ад той вуліцы, дзе на пачатку 80-х гадоў здымалі культавы фільм. Літаральна нядаўна вуліцу знеслі, каб расчысціць месца новым дамам, а калодзеж аднеслі бліжэй да дарогі. Зараз яго можна пазнаць яшчэ і па скульптурнай кампазіцыі двух галоўных герояў — Ходаса і Цімафея, каля якіх ляжыць той самы пёс Валет.

А на месцы прыватнай забудовы ўжо ў найбліжэйшыя гады з'явіцца новы жылы комплекс, які будзе мець выгляд сучаснага шматпавярховага ансамбля. Ужо завершана ўзвядзенне сямі- і дзевяціпавярховага дамоў на 167 кватэр. Зараз вядзецца будаўніцтва каркасна-маналітных высотак на 11 і 14 паверхаў на 240 кватэр. Жыллё тут карыстаецца попытам, і ўсе кватэры ў новых дамах ужо прыдбаны. Мабыць, таму, што месца тут зручнае — абжыты мікрараён, добрае транспартнае злучэнне. Ёсць тут і міні-рынак, але ў новым жылым ансамблі на яго месца прыйдзе сучасны гандлёвы цэнтр.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Сукно»**

**Лот № 1.** Здание строительного цеха с инв. № 500/С-63598. Площадь: 139,7 кв. м. **Местонахождение**: г. Минск, ул. Матусевича, 33/7. **Начальная цена** – 88 000,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток** – 8 800,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 4 400,00 бел. руб. **Обременение**: 1. Аренда до 31.05.2025. **Земельный участок**: площадь 0,0977 га, кадастровый номер 500000000006009295. Право аренды по 30.04.2028.

**Условия аукциона:** Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Объекта в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения аукциона, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов. Установленная в ходе аукциона цена продажи Объекта будет увеличена на сумму налога на добавленную стоимость (НДС 20 %) согласно законодательству Республики Беларусь. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить Организатору аукциона стоимость затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 (пяти) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона. 5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,5 % от цены продажи Объекта без учета НДС в течение 5 (пяти) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 13.05.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

Продавец: ОАО «Сукно», тел. (8017) 363 99 40. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки».

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Сукно», проводимом 13.05.2019 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 12.04.2019 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу Организатора аукциона: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 10.05.2019 в 11.00.

Контактное лицо для осмотра Объекта – Жуковская Татьяна Евгеньевна, тел. 8 (044) 501 62 28.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ДА МІНСКА — РУКОЙ ПАДАЦЬ!

## У Смалявічах пакуль пабудавалі адзін «сталічны» дом

**Да райцэнтра можна даехаць максімум за 35—40 хвілін. З транспартнымі зносінамі тут няма праблемы. Кожныя 10—15 хвілін ходзяць маршруткі. Кошт білета 2,5 рубля. Хочаш дабрацца танней — выбірай электрычку. На ўездзе ў горад каля возера адразу кідаецца ў вочы 9-павярховы дом з прыгожа аздобленым фасадам. Гэты шматпавярховік мясцовыя жыхары называюць мінскім. Пакуль гэта толькі адзін сталічны жылы будынак у райцэнтры.**



21 сакавіка ўступіў у сілу Указ кіраўніка дзяржавы № 103 аб узвядзенні эксперыментальнага жылога дома. Гэта будзе дом на 156 кватэр у Паўночна-Заходнім мікраараёне.

— З таго часу, як уступіў у дзеянне Указ Прэзідэнта № 214 аб развіцці гарадоў-спадарожнікаў, Мінгарвыканкам пабудаваў у Смалявічах 142-кватэрны жылы дом для сталічных жыхароў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — расказаў **намеснік старшыні Смалявіцкага райвыканкама па пытаннях будаўніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мікалай ПАРАМОНАЎ.** — Акрамя таго, 21 сакавіка ўступіў у сілу Указ кіраўніка дзяржавы № 103 аб узвядзенні эксперыментальнага жылога дома. Гэта будзе дом на 156 кватэр у Паўночна-Заходнім мікраараёне.

Будаўніцтва будзе ажыццяўляцца ў 2019—2020 гадах долевым спосабам, заказчыкам выступае УКБ Мінаблвыканкама. У Смалявічы перасяляцца мінчане, якія стаяць на чарзе і маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У райцэнтры прадугледжана будаўніцтва аўтастанцыі. Магчыма, тут з'явіцца і пуцеправод цераз чыгунку. З улікам таго, што горад будзе расці, спатрэбяцца і новыя медыцынскія ўстановы, месцы адпачынку, культурна-забаўляльныя цэнтры. Але пакуль казаць пра гэта рана.

Паўночна-Заходні мікраараён, дзе стаіць сталічны дом, актыўна забудоўваецца, але сваімі сіламі і для грамадзян горада і раёна. У перспектыве тут прадугледжана каля 200 тысяч квадратных метраў жылля. Пакуль жа пабудаваныя тры дамы, вядзецца будаўніцтва яшчэ аднаго 242-кватэрнага. У планах на наступны год — тры шматпавярховікі на 60, 80 і 100 кватэр. Тут ужо адкрыўся новы дзіцячы сад. У перспектыве з'явіцца яшчэ адзін на 230 месцаў, а таксама — школа на 720 месцаў. У навучальных установах прадугледжаны сучасныя плавальныя басейны. Гэтыя два аб'екты ўключаны ў абласную інвестыцыйную праграму, і пачатак будаўніцтва плануецца ў другой палове 2019-га. Школу па нарматывах павінны ўзвесці за васямнаццаць, а садок — за сем месяцаў і ўвесці гэтыя сацыяльна значныя аб'екты ў эксплуатацыю ў 2020-м.

Дадам, што ў Паўночна-Заходнім будуецца і шматфункцыянальны гандлёвы цэнтр.

— У Смалявічах дастаткова прыватных крам, аб'ектаў райспажыўсаюза. Але менавіта такіх, дзе можна закупіць усё неабходнае адразу, няма, — лічыць мясцовая жыхарка Кацярына. — Мяркую, што ў новым гандлёвым пункце можна будзе набыць і прадукты харчавання, і адзенне, і тавары паўсядзённага попыту, а заадно наведаць цырульню, выпіць гарбаты або кавы.

У Смалявічы перасяляцца мінчане, якія стаяць на чарзе і маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Віктар пераехаў з сям'ёй у Смалявічы з Мінска, уладкаваўся кіроўцам. Як кажа мужчына, яму тут падабаецца жыць: ціха, спакойна. Яго дзеці ўжо дарослыя, таму няма патрэбы ў школе і садку. Але для тых, хто гадуе малых, гэтае пытанне актуальнае. Таму яго радуе, што ў мікраараёне паралельна з жыллём будуюцца школьная і дашкольная ўстановы. У перспектыве, як лічыць Віктар, іх запатрабуецца больш, паколькі сюды пераедзе шмат маладых сем'яў. А ў цэлым для дзяцей, падлеткаў, па яго словах, у горадзе дастаткова месцаў, дзе яны могуць развівацца, знайсці прымяненне сваім здольнасцям. Узяць хаця б цэнтр творчасці для дзяцей і моладзі.

— Мы імкнёмся да таго, каб грамадзянам розных узростаў было камфортна і зручна жыць як у Смалявічах, так і ў раёне, — кажа Мікалай Парамонаў. — У перспектыве плануем пачаць будаўніцтва новай аўтастанцыі. Праектную дакументацыю мы распрацавалі сумесна з кітайскімі партнёрамі хочам рэалізаваць гэты праект у наступным годзе. У 2016-м запрацавала новая станцыя абезжалезвання, што дазволіла значна палепшыць якасць вады. Вядзём праектаванне па пракладцы новых сетак водазабеспячэння, ачышчальных збудаванняў. Горад расце, развіваецца, павялічваецца колькасць насельніцтва, прадпрыемстваў. Таму гэтыя пытанні для нас надзвычай актуальныя.

**— І ўсё ж якому тыпу жылля аддаяце перавагу?** — пацікавілася ў Мікалая Парамонава.

— Арыентуемся на наступныя суадносіны: 60 працэнтаў індывідуальнага і 40 працэнтаў шматкватэрнага. На сённяшні дзень у нас дастаткова зямельных участкаў, дзе можна ажыццяўляць будаўніцтва. Мы хочам разгледзець варыянт комплекснай індывідуальнай забудовы. Прапанавалі інвестарам азнаёміцца з кварталамі, якія для яе адведзены, каб яны зрабілі эскізы. Шляхам конкурсу плануем выбраць аднаго забудоўшчыка. Як гэта атрымаецца, сказаць пакуль цяжка. Шэраг арганізацый зацікавіліся прапановай, але пакуль мы не атрымалі канчатковага адказу.

Пляцоўкі, дзе разглядаецца комплексная забудова, забяспечаны мінімальнай інфраструктурай. Што датычыцца выдзялення і продажу ўчасткаў на аўкцыёнах фізічным асобам, то яны фарміруюцца таксама з улікам хаця б частковай забяспечанасці камунікацыямі. Летась у горадзе сваімі сіламі пабудавалі 86 тысяч квадратных метраў жылля. Сёлета даведзена заданне ўзвесці 104,5 «квадрата». У далейшай перспектыве ў Смалявічах жыллёваму будаўніцтву будуць аддаваць увагу.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**




### Открытое акционерное общество «Белтрубопроводстрой»

**Информация об акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 1 января 2019 г.**

4. Доля государства в уставном фонде эмитента ___0 %_____ (всего в процентах),
в том числе:

| Вид собственности | Количество акций, штук | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| Республиканская | - | - |
| Коммунальная – всего | - | - |
| В том числе: областная | - - | - - |
| районная | - | - |
| городская | - | - |

5–6. Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателя | | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | | лиц | 1107 | 1115 |
| в том числе: юридических лиц | | лиц | 5 | 7 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | | лиц | 0 | 2 |
| в том числе: физических лиц | | лиц | 1102 | 1108 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | | лиц | 25 | 25 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | | тысяч рублей | - | - |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | | тысяч рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | | рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) | | X | X | X |
| типа _______ | | рублей | - | - |
| типа_______ | | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) | | - | - | - |
| типа _______ | | рублей | - | - |
| типа_______ | | рублей | - | - |
| Период, за который выплачивались дивиденды | | месяц, квартал, год | - | X |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | | число, месяц, год | - | X |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | | число, месяц, год | - | X |
| Обеспеченность акции имуществом общества | | рублей | 20,8 | 8,06 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего | | штук | - | - |
| В том числе: поступившие в распоряжение общества: | | | - | - |
| дата зачисления акций на счет «депо» общества | количество акций | штук | срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества | |
| - | - | - | - | |
| - | - | - | - | |
| - | - | - | - | |
| приобретенные в целях сокращения общего количества акций: | | - | - | - |
| дата зачисления акций на счет «депо» общества | количество акций | штук | - | X |
| - | - | - | - | X |
| - | - | - | - | X |

7. Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 85 139,00 | 44 635,00 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 77 854,00 | 43 089,00 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | 5838,00 | -1686,00 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 7285,00 | 1546 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -139,00 | -1562 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | -1308,00 | -1670,00 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 347,00 | -207,00 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | 5491,00 | -1479 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | -95,00 | -5590 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 6395 | 14 803 |

8. Среднесписочная численность работающих (человек) – 482 человека.

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20 и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): строительство трубопроводов.

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 29 марта 2019 г.

13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета): в своей деятельности Общество руководствуется Правилами корпоративного поведения. Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг утвержден Решением Совета директоров 30.10.2009 г.

14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети интернет www.beltps.by.

УНП 100364117

МЕРКАВАННЕ

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ РЭГІЁНАЎ — ШЛЯХ ДА ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ

**Надрукаваныя ў № 9 «МС» матэрыялы выклікалі ў мяне вялікую цікавасць, паколькі закранаюць актуальную для Беларусі (як і для большасці краін свету) праблему — устойлівага рэгіянальнага развіцця. Мне як эканомікагеографу таксама даводзілася неаднойчы звяртацца да гэтай праблемы, у сувязі з чым хацелася б выказацца адносна некаторых яе аспектаў.**

Найперш трэба ўсвядоміць, што **моцная дзяржава — гэта развітыя ў сацыяльна-эканамічных адносінах усе яе рэгіёны.** Хаця бываюць выпадкі, калі агульны высокі ўзровень эканамічнага развіцця краіны можа забяспечваць адносна невялікая колькасць яе рэгіёнаў (напрыклад, Канада, Аўстралія). Аднак вядома, што кожная дзяржава, у тым ліку і Беларусь, павінна быць зацікаўлена ў паспяховым развіцці ўсіх сваіх частак. На жаль, вопыт сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на працягу апошніх дзесяцігоддзяў сведчыць аб тым, што такое развіццё мела месца далёка не ва ўсіх яе рэгіёнах. Ды і старшыні абласных Саветаў дэпутатаў, як у гэтым нумары «МС», так і ў папярэдніх, неаднойчы звярталі на гэта ўвагу. Казаць пра важнасць раўнамернага развіцця рэгіёнаў, на маю думку, увогуле няправільна. Пры рознай іх забяспечанасці прыроднымі і працоўнымі рэсурсамі, аб'ектамі вытворчай і сацыяльнай інфраструктуры, розных прыродных і транспартна-геаграфічных умовах часцей даводзіцца мець справу з павелічэннем міжрэгіянальнай дыферэнцыяцыі і, як вынік, ростам тэрытарыяльных дыспрапорцый. Інакш кажучы, сёння правільней гаварыць пра імкненне да **змяншэння высокай міжрэгіянальнай дыферэнцыяцыі,** а не пра раўнамернае развіццё рэгіёнаў. Вядома, што ў рамках міжбюджэтных адносін субвенцыі і датацыі ў пэўнай ступені змяншаюць гэту дыферэнцыяцыю, але не да такой ступені, каб можна было казаць аб раўнамерным развіцці. Факты сведчаць, што нават на ўзроўні абласцей розніца ў вытворчасці ВРП перавышае два разы (паміж Мінскай і Магілёўскай абласцямі), пры гэтым назіраецца тэндэнцыя да яе павелічэння. Ва ўмовах рыначнага развіцця эканомікі, пераканаты, яна будзе захоўвацца. У гэтай сувязі вельмі важна вызначыцца з прыярытэтнымі кірункамі далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця (СЭР) як Беларусі, так і яе рэгіёнаў.

Міжабласныя адрозненні не ахопліваюць усёй разнастайнасці сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны. Адрозненні паміж раёнамі ўнутры адной вобласці заўсёды з'яўляюцца значна большымі, чым паміж абласцямі. У сувязі з тым, што адміністрацыйныя раёны неаднастайныя нават у межах аднаго рэгіёна (вобласці), вельмі важнай уяўляецца **комплексная ацэнка ўзроўню іх сацыяльна-эканамічнага развіцця.** Гэта значыць, толькі на падставе розных адносных эканамічных (прадукцыя прамысловай вытворчасці на аднаго занятага, валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі на аднаго занятага, інвестыцыі ў асноўны капітал на аднаго чалавека, рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі, работ і паслуг арганізацый, адносіны экспарту тавараў і паслуг да іх імпарту і інш.) і сацыяльных (сярэднямесячная намінальная налічаная заработная плата работнікаў, сярэднедушавы аб'ём рознічнага тавараабароту гандлёвых арганізацый, агульны аб'ём платных паслуг на аднаго чалавека, забяспечанасць




насельніцтва жыллём і ўзровень яго добраўпарадкавання і інш.) паказчыкаў за некалькі гадоў можна атрымаць больш-менш поўнае ўяўленне аб розных відах эканамічнай дзейнасці і ахапіць прама ці ўскосна разнастайныя бакі жыцця людзей раёнаў Беларусі. Супастаўляючы кожны з паказчыкаў, якія аналізуюцца, з сярэднімі значэннямі па краіне і падсумоўваючы іх, можна атрымаць інтэгральную ацэнку ўзроўню СЭР кожнага з раёнаў і правесці іх тыпалогію. Трэба адзначыць, што група раёнаў з нізкім і вельмі нізкім узроўнем СЭР перавышае палову ўсіх раёнаў краіны, і гэта прымушае задумацца і прымаць сур'ёзныя меры па выпраўленні сітуацыі. Прычыны высокай дыферэнцыяцыі ўзроўню СЭР раёнаў разнастайныя. У найбольшай ступені яны звязаны з рознай структурай іх эканомікі, асаблівасцямі яе фарміравання на працягу апошніх дзесяцігоддзяў, у значнай ступені на яе паўплывалі асаблівасці рассялення насельніцтва, эканоміка-геаграфічнае становішча раёнаў, забяспечанасць іх працоўнымі і прыроднымі рэсурсамі, аб'ектамі сацыяльнай інфраструктуры і інш. Акрамя гэтых аб'ектыўных прычын, пэўную ролю адыгралі і суб'ектыўныя фактары, звязаныя з інстытуцыянальнымі пераўтварэннямі, якія ажыццяўляе ўрад на рэгіянальным узроўні: развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, бюджэтнае фінансаванне, палітыка падаткаабкладання і г. д. Аднак, нягледзячы на розны характар прычын тэрытарыяльнай дыферэнцыяцыі, галоўнай застаецца праблема яе змяншэння (там, дзе яна неапраўдана высокая). Пры гэтым шляхі вырашэння праблемы таксама павінны быць дыферэнцыраванымі, гэта значыць для кожнага тыпу раёнаў патрабуецца свой «набор» мерапрыемстваў.

Такім чынам, у краіне належыць яшчэ шмат зрабіць для таго, каб аслабіць дыферэнцыяцыю ва ўзроўні СЭР яе рэгіёнаў. Вопыт сведчыць, што толькі на гэтым шляху можа адбыцца змяншэнне адрозненняў ва ўзроўні і якасці жыцця іх насельніцтва.

**З удзячнасцю і павагай**
**кандыдат геаграфічных навук,**
**дацэнт Вячаслаў САСНОЎСКІ,**
*г. п. Смілавічы.*

ІНІЦЫЯТЫВА

# Дзе чакаць аўтакраму?

**Калі ў вёсцы няма стацыянарных магазінаў, дамоў культуры, бібліятэк, для людзей і выхад да аўтакрамы — сапраўднае свята. Таму сюды часта і прыходзяць загадзя — проста каб пагутарыць, не прапусціць навіны, падзяліцца рэцэптамі, пахваліцца дзецьмі і ўнукамі. А каб бабулям і дзядулям не давялося незнарок прамокнуць у час чакання, грамадскае аб'яднаннне «Кобрынскі клуб дзелавых жанчын «Бона» і Батчынскі сельскі Савет дэпутатаў запусцілі праект «З клопатам пра блізкага». У шасці вёсках з'явіліся адзінаццаць крытых навесаў у месцах чакання аўтакрам.**

Усе пытанні актывісты вырашалі сумесна з мясцовымі ўладамі. Трэба было вызначыць, як будуць выглядаць будучыя прыпынкі, які расход матэрыялаў, дзе знайсці валанцёраў — усё ж грошы ў межах праграмы «ТАНДЭМ IV» (якая рэалізуецца дзякуючы падтрымцы Еўрапейскай асацыяцыі мясцовай дэмакратыі — ALDA і грамадскага аб'яднання «Фонд імя Льва Сапегі») выдзяляліся толькі на будматэрыялы. А ўжо правесці зварачныя работы і ўсталяваць пляцоўкі трэба было сваімі сіламі. І як заўважыла каардынатар праекта Алена Мезенцава, поспех шмат у чым залежаў ад узаемаадносін жыхароў з органамі ўлады. «Мы паабяцалі Сямёнаўне. Як маглі не прыйсці?» — дзяліліся вяскоўцы, якія адгукнуліся на просьбу старшыні сельскага Савета Святланы Гангалы. Мужчыны праводзілі зварачныя работы ў гаражах, а пасля вяскоўцы вырашалі, як гатовыя каркасы даставіць на месца прыпынку (часам даводзілася і на кані падвозіць). На дапамогу клікалі ўнукаў і мужчын з суседніх вёсак...

Дзякуючы гэтаму праекту вяскоўцы атрымалі добраабсталяваныя месцы для зносін. На прыпынках ёсць лаўкі, размяшчаюцца стэнды з інфармацыяй па гісторыі дадзеных населеных пунктаў, пра вядомых людзей, якія тут жылі. Прадугледжаны і кішэні-ўкладышы, дзе могуць размяшчацца розныя аб'явы і віншаванні.

«Развіццё немагчымае без актывізацыі мясцовай супольнасці», — упэўнены ў Кобрынскім клубе дзелавых жанчын. Дзякуючы дыялогу і супрацоўніцтву з мясцовымі ўладамі ў раёне былі таксама здзейснены і іншыя добрыя справы. У пасёлку Птушкафабрыка з'явіліся шыкоўная дзіцячая пляцоўка і сцэна для правядзення свят і мерапрыемстваў, дарэчы, на ўрачыстае адкрыццё апошняй сабралася больш за 150 чалавек. І зноў жа ўсё было ўзведзена бескарыслівымі работнікамі. Сумесная добрая справа з'яднала мясцовых жыхароў, і яны думаюць аб тым, што б яшчэ зрабіць для сваёй малой радзімы.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

PARITETBANK

## Бухгалтерский баланс на 1 апреля 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2019 | 01.01.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 24 191 | 25 839 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 53 969 | 43 829 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 21 413 | 7 390 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 132 302 | 129 910 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 208 420 | 215 150 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 150 | 150 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 36 772 | 36 452 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 109 | 122 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 83 | 83 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 5 234 | 5 715 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | **482 643** | **464 640** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 1 304 | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 76 065 | 99 075 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 273 985 | 238 598 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 15 514 | 12 035 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 93 | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | 1 | 1 |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 1 806 | 1 769 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | **368 768** | **351 478** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 66 056 | 66 056 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 4 227 | 4 017 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 14 760 | 14 994 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 28 832 | 28 095 |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | **113 875** | **113 162** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | **482 643** | **464 640** |

## Отчет о прибылях и убытках на 1 апреля 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2019 | 01.04.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 7 255 | 6 145 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 3 977 | 1 987 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 3 278 | 4 158 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 3 618 | 1 062 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 652 | 273 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 2 966 | 789 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | 1 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 710 | (303) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 1 112 | 631 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 177 | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 988 | (794) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 339 | 384 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 6 060 | 4 198 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 259 | 192 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 275 | 2 064 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 329 | 238 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | **946** | **1 826** |

Председатель Правления И.В. Катибников
Зам. главного бухгалтера О.Н. Шилова
Дата подписания: 4 апреля 2019 г.

Ссылка на публикацию на сайте:
http://www.paritetbank.by/about/finance/kvartal/2019/1_kvartal_2019/

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27 октября 2014 № 5.
УНП 100233809

**Продаю: недорого пчелосемьи, пчелопакеты.**
**Тел.: 8 029 126 23 32, 8 044 736 20 62**

Центр Промышленной Оценки
• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует **о снятии с аукциона, назначенного на 17.04.2019** (публикация извещения в газете «Звязда от 12.03.2019), зданий и сооружений (три лота), расположенных по адресу: **Гродненская обл., Гродненский р-н, Озерский с/с, аг. Озеры,** принадлежащих Филиалу «Гродненское зверохозяйство» торгового унитарного предприятия «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза».
**Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42, www.cpo.by** УНП 500839555

**В извещении о повторном открытом аукционе № 62/19, опубликованном в газете «Звязда» 06.04.19 и объявленном на 22.04.2019, правильным считать:**
– аукцион состоится 15.04.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35а, пом. 701;
– последний день приема заявлений 12.04.2019 г. до 17.00.
УНП 191302068

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

## НАМАГАННІ НА КАРЫСЦЬ

**Дэпутаты Кармянскага райсавета, што на Гомельшчыне, высадзілі рабінавую алею і навялі парадак каля крынічкі.**

У рамках месячніка па добраўпарадкаванні дэпутаты раённага Савета арганізавалі адразу дзве акцыі, піша «Зара над Сожам».

Першая звязана з азеляненнем. Каля новага гандлёвага аб'екта «Санта» з'явілася рабінавая алея. Народныя абраннікі не толькі пасадзілі дрэўцы, але і ўмацавалі калкі і падвязалі саджанцы. Зараз задача кожнага жыхара гарпасёлка паклапаціцца аб тым, каб захаваць маладыя рабінкі.

Другая — навядзенне парадку. Ужо стала добрай традыцыяй кожную вясну добраўпарадкоўваць тэрыторыю вакол крынічкі, што на Куракоўшчыне. Гэтым разам дэпутаты райсавета таксама актыўна папрацавалі, прывёўшы ў парадак такое важнае для тутэйшых жыхароў месца.

## ЗАРАБІЛІ БОЛЬШ ЗА 50 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ

**Жаданне зрабіць свой горад і раён чысцейшым і прыгажэйшым зноў аб'яднала калінкавічан, якія прынялі ўдзел у раённым суботніку, прысвечаным Году малой радзімы і 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Як паведамляюць «Калінкавіцкія навіны», рашэнне правесці суботнік было прынята на чарговай сесіі раённага Савета дэпутатаў. Асноўная мэта — навядзенне парадку на зямлі, а таксама збор грашовых сродкаў для добраўпарадкавання населеных пунктаў раёна.

У першым вясновым суботніку прынялі ўдзел больш за 10 тысяч жыхароў. У іх ліку — прадстаўнікі адміністрацыі раёна, работнікі жыллёва-камунальных службаў, арганізацый і прадпрыемстваў, навучэнцы каледжа і ліцэя, школ.

Усе яны выйшлі папрацаваць на карысць сваёй малой радзімы: займаліся прыборкай могілак, паркаў і сквераў, добраўпарадкаваннем тэрыторый і пасадкай лесу.

Асаблівую ўвагу аддалі навядзенню парадку на мехдварах і жывёлагадоўчых комплексах сельгаспрадпрыемстваў раёна. На дапамогу вяскоўцам прыйшлі брыгады з працоўных калектываў горада.

Дарэчы, мінулы суботнік не стаў завяршальным акордам дзейнасці ў гэтым напрамку: працягваюцца работы па наданні прывабнага выгляду жывёлагадоўчым фермам, мехдварам і іншым аб'ектам сельгаспрадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў раёна.

Як паведаміла **начальнік аддзела эканомікі райвыканкама Святлана ЛАТЫШ,** агульнымі намаганнямі жыхароў раёна, якія пажадалі прыняць удзел у суботніку, было зароблена больш за 50 тысяч рублёў. Усю гэтую суму выдаткуюць на далейшае развіццё і добраўпарадкаванне Калінкавіцкага раёна.

САДЗЕЙНІЧАННЕ ЗАНЯТАСЦІ

# ЯК ДАПАМАГЧЫ САРЫЕНТАВАЦЦА

**На прапанаваныя ў Азарычах варыянты працаўладкавання сямёра пагадзіліся, адна ад прапановы адмовілася. Яшчэ аднаго мясцовага жыхара накіравалі ў бальніцу на абследаванне. Як на Гомельшчыне садзейнічаюць занятасці?**

Як паведамляюць «Калінкавіцкія навіны», пастаянна дзеючая раённая камісія па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва на чале з яе старшынёй Віктарам Замосцікам правяла чарговае пасяджэнне. Спачатку ў Калінкавічах было разгледжана арганізацыйнае пытанне, якое датычылася доступу членаў камісіі да банка даных не занятага ў эканоміцы насельніцтва краіны.

Затым камісія пераехала ў Азарычы, дзе ў будынку мясцовага сельвыканкама адбылася сустрэча з мясцовымі жыхарамі, якія з-за нейкіх прычын цяпер не працуюць.

Як растлумачыла **старшыня сельвыканкама Галіна ПАНЦЯЛЕЕНКА,** па населеных пунктах Азарыцкага сельсавета ў спіс грамадзян, аднесеных да не занятых у эканоміцы, уключаны 73 чалавекі: 17 з іх не падпадаюць ні пад якія льготы; 20 маюць двайное грамадзянства; чатыры прапісаны, але больш за 10 гадоў не пражываюць на тэрыторыі сельсавета; 20 увесь час працуюць у Расійскай Федэрацыі; у васьмі ёсць зямельныя надзелы; сем працуюць і жывуць за межамі сельсавета.

З запрошаных на пасяджэнне камісіі 17 чалавек з'явіліся дзевяць.

Віктар Замосцік растлумачыў прысутным палажэнні дэкрэта аб садзейнічанні занятасці, расказаў аб варыянтах працаўладкавання.

Улічваючы, што амаль усе, хто прыйшоў, схільныя да выпіўкі і перабіваюцца выпадковымі заробкамі не першы год, размова з кожным была персанальнай і грунтоўнай. Сябрам камісіі прыйшлося доўга ім тлумачыць, як можа вярнуцца да нармальнага жыцця.

У выніку шасцёра пагадзіліся працаўладкавацца на прапанаваныя вакансіі ў КСУП «Беразнянскі». Адна вырашыла заняцца рамеснай дзейнасцю. Адна — адмовілася ад усіх прапаноў. Яшчэ адзін мясцовы жыхар накіраваны ў Азарыцкую бальніцу дзеля абследавання яго стану здароўя.

Раённая пастаянна дзеючая камісія па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці і надалей плануе праводзіць такія выязныя сустрэчы-прыёмы з насельніцтвам.

«Практыка паказвае, што не ўсе людзі самастойна могуць сарыентавацца ў жыцці, ім трэба дапамагчы ў гэтым, — адзначыў Віктар Замосцік падчас сустрэчы. — І прызначэнне нашай камісіі ў гэтым і заключаецца».

# ВІДАЦЬ БІЗНЕСМЕНА ПА ЎЛОВЕ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

«Падчас вучобы зразумеў, што трэба скараціць выдаткі і павысіць аб'ём вытворчасці. Для гэтага патрэбна адмысловая ёмістасць, якая дапаможа прывозіць на продаж больш рыбы і пазбегнуць страт: жывую рыбу, што не прадалася, можна выпусціць», — тлумачыць Артур.

Выкладчыкі растлумачылі, што ў малым бізнесе асабліва важную ролю іграе аптымізацыя выдаткаў, — кантэйнер дапаможа вырашыць гэтую праблему. Набыць патрэбнае абсталяванне магчымасці ў сям'і не было — а тут перамога ў конкурсе бізнес-праектаў сярод маладых бізнесменаў, якім завяршылася навучанне ў Чавусах.

Аўтары найлепшых бізнес-ідэй атрымалі фінансаванне на закупку неабходных інструментаў ці абсталявання. Доўгачаканую ёмістасць для перавозкі рыбы Шапяцько атрымаюць цягам двух месяцаў — новы сезон пачнецца ўжо з іншымі маштабамі.

Як і для яшчэ адной пераможцы — **Аксаны ЗАВАДСКАЙ,** уладальніцы першага ў Чавусах дзіцячага цэнтра развіцця. Цэнтр і сам яшчэ ва ўзросце немаўляці — восем месяцаў, але хутка стаў папулярным у маладых бацькоў.

Пачаўся бізнес, калі дзяўчына засталася без працы педагога дашкольнай адукацыі. А маладой маці не хацелася адмаўляцца ад любімай справы. «У маленькім горадзе ўсе адно адного ведаюць, да любога пачынання ставіцца з пагадзронасцю. Адкрываць свой цэнтр вельмі страшна, але жаданне было мацнейшае», — дзеліцца Аксана.

У яе не было эканамічнай адукацыі і досведу ў бізнесе, таму знаёмства з дырэктарам Чавускага бізнес-цэнтра Сяргеем Клімянковым стала падарункам лёсу. Будучай прадпрымальніцы параілі звярнуцца ў цэнтр занятасці, каб пазней атрымаць субсідыю на адкрыццё сваёй справы. Дзякуючы тым сродкам, сямейным зберажэнням і невялікаму крэдыту праз колькі месяцаў дзяўчына адчыніла дзверы новага цэнтра для першых вучняў.

Сёння Аксана плануе пашырыць спіс паслуг і ўвесці групы па фітнесе і ёзе. Канкурэнтаў у горадзе пакуль няма, а набыць спартінвентар і тое, што неабходна для заняткаў, дапаможа грашовы прыз, заваяваны на конкурсе бізнес-ідэй.



**Артур ШАПЯЦЬКО з жонкай Таццянай.**

Акрамя Артура і Аксаны фінансаванне праектаў атрымалі яшчэ тры ўдзельнікі конкурсу. Гэтае мерапрыемства стала адной з першых ініцыятыў Чавускага бізнес-цэнтра, што быў адкрыты нядаўна ў рамках праекта ПРААН і Міністэрства эканомікі «Малыя гарады» пры падтрымцы Расійскай Федэрацыі. Аналагічныя арганізацыі створаны ў Крычаве, Горках і Мсціслаўе (Магілёўская вобласць), Баранí і Глыбокім (Віцебская вобласць).

«Да канца года ў рамках праекта навучанне і прафесійныя кансультацыі ў новых цэнтрах падтрымкі можна атрымаць бясплатна. Потым бізнес-інкубатары павінны выйсці на самаакупнасць і прапаноўваць паслугі, якія будуць запатрабаваны ў мясцовых прадпрымальнікаў», — падкрэслівае **кіраўнік праекта «Малыя гарады» Марына КАЛІНОЎСКАЯ.**

**Варвара МАРОЗАВА, фота аўтара.**

# «ВУДА» ДЛЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ

### У Гомелі правядуць найбуйнейшы з пачатку года кірмаш вакансій

**Да Адзінага дня занятасці, што пройдзе 25 красавіка, тут рыхтуюцца вельмі сур'ёзна.**

Як расказалі газеце «Савецкі раён» у гарадскім упраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, на кірмаш прыйдуць прадстаўнікі кадравых службаў прадпрыемстваў і арганізацый будаўнічай, гандлёвай, прамысловай, транспартнай галін як дзяржаўнай, так і прыватнай формаў уласнасці.

Свае вакансіі прапануюць прыблізна 17 арганізацый, але да даты правядзення іх колькасць можа яшчэ павялічыцца. Свой удзел у кірмашы ўжо пацвердзілі «Гомельжалезабетон», «Гомельпрамбуд», «Гомельдрэў», завод станочных вузлоў, «Камінтэрн». Усім патрабуюцца як рабочыя, так і інжынерна-тэхнічны персанал.

Члены грамадскіх аб'яднанняў раскажуць аб магчымасцях працаўладкавання інвалідаў. Упраўленне па працы разлічвае на ўдзел у мерапрыемстве прадстаўнікоў «Святлатэхнікі» і «Віпра».

Інфармацыю пра абарону правоў работнікаў можна будзе атрымаць у інспектараў прафсаюзаў. Супрацоўнікі падатковых органаў і спецыялісты ўпраўлення праінфармуюць аб перавагах самастойнай занятасці, перасялення, магчымасцях навучання запатрабаваным на рынку працы прафесіям.

Адзіны дзень занятасці пройдзе з 10 да 13 гадзін на вуліцы Пралетарскай, 18. Кірмаш вакансій стане карысным для беспрацоўных і не занятых у эканоміцы, якія спраўды імкнуцца працаўладкавацца. «Вуду» кінуць нават тым, хто наогул не валодае якой-небудзь кваліфікацыяй.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 11 красавіка 2019 года.**